PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 45 (2426) Год XLVII | Беласток, 10 лістапада 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Выяўленне праўды

У суботу, 26 кастрычніка г.г. на Ваенных могілках у Бельску-Падляшскім адкрылі мемарыяльную табліцу прысвечаную праваслаўным вазакам, забітым у канцы студзеня 1946 года каля вёскі Пухалы-Старыя атрадам польскага падполля пад камандаваннем Рамуальда Райса „Бурага". Трыццаць бязвінных жыхароў былога Бельскага павета пакоіліся паўвека ў чужой зямлі, а іхнія сем'і не ведалі нават пра месца іхняга спачынку. І нават калі злачынства выявілася, знайшліся дзяржаўныя чыноўнікі, якія перашкаджалі напісаць праўду на брацкай магіле сваіх суграмадзян, куды былі перапахаваны іх астанкі. Змаганне за праўду забрала чарговыя пяць гадоў.

Табліцу з эпітафіяй адкрылі Аляксандр Бандарук — прадстаўнік сем'яў пабітых вазакоў, Марэк Стшалінскі — падляшскі ваявода і Андрэй Сцепанюк — бурмістр Бельска-Падляшскага. У кароткай прамове мітрапаліт Сава сказаў м.інш.:

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

— Саракавыя гады, гэта вялікі боль нашай Царкве і нашаму народу; дзякуй Богу, што сёння можам пра гэта гаварыць. Дзякуй ваяводзе, што давёў справу да канца. Хай гэтая табліца будзе напамінам, каб больш у нашай краіне не было такой трагедыі.

Пасля мітрапаліт Сава з епіскапам бельскім Грыгорыем у саслужэнні духавенства адслужылі паніхіду.

На заканчэнне ўрачыстасці на магілу былі ўскладзены вянкі. Памяць бязвінных ахвяр злачынства ўшанавалі м.інш. ваявода Марэк Стшалінскі з віцэ-ваяводам Ежы Паўяновічам, сенатар Сяргей Плева, паслы Аляксандр Чуж і Яўген Чыквін, гайнаўскі стараста Уладзімір Пятрочук, бельскі бурмістр Андрэй Сцепанюк, сямейнікі.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Чым заняўся БВК пасля выбараў — невядома. Не хаўтурамі — гэта дакладна

Яшчэ камітэт-два і аформім усе справы

У выбарах трэба прымаць удзел. Яны раз у некалькі гадоў скарэктоўваюць светагляд чалавека. Карэктура гэтая неабходная, каб не разысціся з плыняй свайго часу. Калі чалавеку збольшага вядома, што думаюць пра яго непрыхільнікі, то выбары ствараюць унікальную нагоду пачуць усю аголеную праўду і ад патэнцыйных прыяцеляў.

Беларускі выбарчы камітэт (БВК) паспяхова зарэгістраваў спіскі сваіх кандыдатаў у Гарадскую раду Беластока ўва ўсіх выбарчых акругах горада, што дало яму права паставіць свайго кандыдата і ў прэзідэнты. Абодва гэтыя факты спрычыніліся да неўтаймаванай раздражненасці ўсіх, каму ўяўлялася, што г.зв. „наш электарат" прыручаны і ніякіх „неспадзевак" тут не можа быць. Раздражненасць вылілася ў канкрэтную формулу — „Якім правам можна было завязаць такі камітэт?" Быццам беларускае пытанне знікла з паверхні планеты ці гібернавалася на дзве тысячы гадоў. І такім чынам упалі сама менш два міфы.

Першы з іх датычыць г.зв. „традыцыйнай прыхільнасці левага руху" да беларускага пытання ў Польшчы. Спадкаемцы левага руху — Саюз левай дэмакратыі — у момант узнікнення БВК у Беластоку паставілі сабе пытанне: „Як кампраметаваць БВК?" Гэтая мэта аказалася не надта каб дасягальнай у тых умовах, калі грамадства спадзяецца на станоўчыя якасці ад выбарчай кампаніі. БВК павёў сябе вельмі спакойна і не пайшоў на палаянку, якая яму прапаноўвалася.

Другі міф такі, быццам беларушчына жыве тут дзякуючы праваслаўю. На такую падтрымку гадоў некалькі ніхто ўжо ўсур'ёз не разлічвае. Ёсць часамі яшчэ спадзяванне, што прынамсі не будзе беларусам перашкоды з боку Царквы. На сёлетніх выбарах абрынула і гэтае апошняе спадзяванне. На тыдзень да галасавання ўва ўсіх святынях Беластока прагучала агітацыя за спіскамі СЛД-УП, а эсэлдоўскія лістоўкі распаўсюджваліся ў храме. І фактычна, царкоўныя кандыдаты на спісках СЛД дасягнулі на выбарах самых высокіх вынікаў, яны нават сталі выбарчым маторам для сваіх калег-католікаў з СЛД. Цана гэтага аказалася таксама высокай — Царква ў Беластоку адкрытым тэкстам адмовілася ад сваёй палітычнай *непорочности*.

Перакананне, быццам самастойны ўдзел у выбарах не гарантуе ў Беластоку дасягнення 5-працэнтнага выбарчага парога не зусім праўдзівае. Беларускі выбарчы камітэт ва ўмовах крайне неспрыяльнай яму прапаганды разышоўся з гэтым бар'ерам усяго на няпоўную сотню галасоў — ува ўсім горадзе прагаласавала за яго 3 498 чалавек. Дзяльба мандатаў пачыналася з 3 594 галасоў. Наступным разам. У Беластоку ўзгадаваўся самастойны ў поглядах выбаршчык, якому беларушчына — не сорам і не Божая кара.

Гаварыць аднак, што выбары закончыліся паражэннем таксама не да канца праўдзіва. Палітычная актыўнасць беларусаў на Беласточчыне, як прынцып, прычыняецца да ўзмоцненай пільнасці цэнтральных улад да Падляшша. Завяршэнне выбарчай кампаніі ў самаўрады — гэта некалькі акцый, якія мелі падмацаваць вобраз кіруючага ў краіне СЛД у вачах нашай грамадскасці. Ці будзе насельнікам Беласточчыны толк ад новых пагранічных заставаў у Міхалове і Дубічах — убачым. Мабыць, знойдзе там працу прыбіральшчыца-дзве. Напэўна пастаіць у Бельску помнік, на якім ахвяры называюцца ахвярамі, а забойцы — забойцамі (чытайце побач). На Беласточчыне знойдзем яшчэ не адну такую гістарычную праўду. З яе ўскрыццём давядзецца аднак пачакаць новых выбараў і новых беларускіх выбарчых камітэтаў.

Аляксандр Максімюк

Скандал на Беласточчыне ☞ 2

СЛД звычайна прыняў некалькіх царкоўных дзеячаў на свае выбарчыя спіскі. Стваральнікамі форуму былі ў большасці дзеячы, якія лічаць сябе праваслаўнымі палякамі, але чытач „Советской Белоруссии" даведаецца, што на Беласточчыне адным фронтам ідуць беларусы, рускія і ўкраінцы і толькі раскольнікі — беларускія нацыяналісты імкнуцца не дапусціць да ўлады гэты прасавецкі лагер на Беласточчыне.

Мір „на зважай"! ☞ 4

Замак у Міры ад уваходу адноўлены, ад чорнага ходу вядуцца рамонтныя працы. Від замка станоўча ўражвае. У ліпені Мір наведаў сам прэзідэнт ЮНЕСКА. На сцяне табліца: Замкавы комплекс Мір. Уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў 2000 г.

Юбілей калектыву „Арэшкі" ☞ 5

Калектыў „Арэшкі" паўстаў у 1972 годзе па ініцыятыве Аляксандра Лукашука, настаўніка з Белавежы. Каля двух гадоў з калектывам супрацоўнічаў Янка Крупа, цяпер „Арэшкі" працуюць без інструктара. Калектыў выступаў у Сямятычах, Драгічыне, Сувалках, Пуцку, Варшаве, Сопаце, Пуньску, Гродне.

Любіце друг друга ☞ 9

9 кастрычніка вернікі шчыльна запоўнілі царкву ў Орлі. Пусцей было толькі навокал храма; мабыць, першая зімніца паўплывала на тых — сёлета іх было значна менш, — якія ўжо па прывычцы не ўваходзяць у храм, а стаяць на пляцы або за плотам каля брамы, дзе можна пакурыць, пагутарыць або абысці ларкі. Уваходзяць яны на царкоўны пляц тады, калі раздаюцца званы і пачынаецца хрэсны ход.

Настаўнік і дзеяч ☞ 10

Аляксандр Іванюк належаў да ліку пятнаццаці заснавальнікаў Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея ў Гайнаўцы. Увесь час знаходзіўся ў праўленні камітэта і яго прэзідыуме, разам са сваімі выхаванцамі дапамагаў будаваць музей.

У гміну і павет ☞ 11

Асвячэнне і афіцыйная здача ў карыстанне 6-кіламетравай павятовай дарогі з Новага Беразова ў Чыжы, якое адбылося 6 кастрычніка ў Шастакове, завяршыло трохгадовую яе будову. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі гмінных і павятовых улад.

Беларусь — беларусы

Інтэграцыя і дэпартацыя

Даволі прыкрая і ў той жа час паказальная з'ява адбылася ў Беларусі напрыканцы мінулага месяца. 23 кастрычніка з мінскага аэрапорта быў дэпартаваны толькі што туды прыбыўшы дэпутат расійскай Думы, лідэр партыі Саюз правых сіл (СПС) Барыс Нямцоў.

Выпадак беспрэцэдэнтны. Да кіраўніка адной з фракцый расійскага парламента падышлі супрацоўнікі беларускіх спецслужбаў і сваімі далейшымі дзеяннямі зрабілі немагчымым знаходжанне на тэрыторыі Беларусі не толькі Нямцова, але і яго спадарожнікаў — дэпутата Думы Ірыны Хакамады і палітолага Сяргея Маркава.

Але аб усім па парадку. Дзеянні А. Лукашэнкі накіраваны на нібыта інтэграцыю Беларусі і Расіі далі не зусім чаканы для яго вынік. Аб прапановах расійскага прэзідэнта У. Пуціна, якія не толькі нарабілі шмат шуму, але і высветлілі неўтаймаванае жаданне беларускага лідэра стаць кімсьці кшталту імператара ўсяе Русі, сказана многа. У выніку летніх заяў Пуціна, А. Лукашэнка пачаў падаваць сябе ў выглядзе ледзьве не самага апантанага абаронцы незалежнасці Беларусі, забыўшы пра тое, што напярэдадні казаў аб гатоўнасці ісці настолькі далёка па шляху інтэграцыі з Расіяй, наколькі згодна апошняя.

Але калі зроблены крок, мусіць быць след. Амаль восем гадоў большая частка беларускага грамадства прыхільна ставілася да абранага „інтэграцыйнага" шляху. Камусьці мроілася аб аднаўленні СССР, кімсьці арганічна не ўспрымалася думка аб магчымасці існавання Беларусі як самастойнай дзяржавы, а хтосьці жыў і жыве жаданнем проста не мець паміж сабой і сваімі родзічамі ў Расіі ніякіх межаў. Больш таго, ідэя інтэграцыі актыўна падтрымлівалася насельніцтвам Беларусі, якое згадзілася на выцясненне з афіцыйнай палітыкі дэмакратычнай незалежніцкай апазіцыі і прычапленне на яе ярлыкоў „нацыянал-радыкалаў" і „дзермакратаў".

Як казаў хтосьці з вялікіх — можна доўга дурыць аднаго чалавека, можна нядоўга дурыць усіх людзей, але нельга ўсіх дурыць доўга. Гэтыя самыя „нацыянал-радыкалы" і „дзермакраты" пачалі дзейнічаць у накірунку інтэграцыі з Расіяй. І тут высветліўся яшчэ адзін цікавы бок палітыкі сённяшняга беларускага прэзідэнта. Апазіцыянеры не сталі яму паплечнікамі ў справе „яднання" беларускага і рускага народаў. Наадварот, узнікла канкурэнцыя і даволі жорсткая.

Найбольш актыўна на „ўсходнім" накірунку апошнім часам дзейнічае Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП), якая займела даволі шчыльныя стасункі з вышэйзгаданым СПС, лідэр якога і быў запрошаны ў Мінск на адмысловую канферэнцыю па праблемах беларуска-расійскай інтэграцыі. Трэба адзначыць, што ранейшыя выказванні Б. Нямцова аб метадах кіравання і ўвогуле палітыцы А. Лукашэнкі, мякка кажучы, не лашчылі слых апошняга. Зважаючы на надзвычайную эмацыянальнасць беларускага лідэра, можна зразумець, што ўся крытыка ў ягоны адрас успрымаецца ім як асабістая абраза, якая штурхае да помсты. Бо менавіта так усведамляецца дэпартацыя Нямцова з Беларусі і фактычнае абвяшчэнне яго персонай нон-грата.

Міністэрства замежных спраў Беларусі распавяло, што дзеянні ўлад былі абумоўлены парушэннем гэтым расіянінам „Закону аб прававым становішчы замежных грамадзян". Нямцоў нібыта „неаднаразова ўмешваўся ва ўнутраныя справы Беларусі, а ягоная дзейнасць накіраваная на нанясенне шкоды дзяржаўным інтарэсам краіны". Такое тлумачэнне хамства ў дачыненні да іншай думкі і выказванняў, як кажуць, шытае белымі ніткамі. Па-першае, сам Лукашэнка казаў аб тым, што беларусы і расіяне не павінны адчуваць сябе замежнікамі адзін да аднаго і зараз перайсці мяжу Расіі з Беларуссю ўсё роўна як перайсці на другі бок вуліцы. Па-другое, хто і калі вызначыў шкоднасць дзеянняў для беларускага грамадства Б. Нямцова, які, між іншым, не толькі лідэр буйной расійскай партыі, але і прадстаўляе ў парламенце Расіі добры кавалак яе насельніцтва.

Першая рэакцыя на інцыдэнт з боку расійскіх палітыкаў — з гэтым трэба разбірацца. Падзея, натуральна, будзе закранута на слуханнях датычных беларуска-расійскай інтэграцыі, што запланаваныя ў Думе на 12 лістапада.

На даны ж момант, больш пільную ўвагу ўсіх прыцягнуў да сябе тэракт у маскоўскім тэатры, які адбыўся акурат у тыя дні. Гэта зразумела. Адметна, што год таму ад абмеркавання парушэнняў падчас прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі ўвагу сусветнай грамадскасці адцягнулі падзеі 11 верасня ў Нью-Йорку. Праўда, знешняя палітыка Расіі пасля іх змянілася не ў лепшы для беларускага лідэра бок. Што будзе сёлета? Падаецца, што беларуска-расійскія адносіны чакаюць новыя ўскладненні.

Уладзімір Лапцэвіч

Выстава ілюстрацый В. Шаранговіча

31 кастрычніка 2002 года ў выставачнай зале Міністэрства замежных спраў Беларусі адбылася цырымонія адкрыцця выставы ілюстрацый да юбілейнага выдання паэмы Я. Коласа „Новая зямля" народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча.

Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Міхаіл Хвастоў адзначыў, што шматлікія ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды 120-годдзя славутых беларускіх песняроў Я. Купалы і Я. Коласа адбываюцца як у Беларусі, так і далёка за яе межамі. Іх арганізатарамі і актыўнымі ўдзельнікамі выступаюць беларускія замежныя ўстановы сумесна з аматарамі творчасці Купалы і Коласа, прадстаўнікамі беларускай дыяспары.

Кіраўнік МЗС прыгадаў, што 29 кастрычніка г.г. у Сейме Літоўскай Рэспублікі адбылося ўрачыстае адкрыццё фотавыставы „Шляхамі Купалы і Коласа" і экспазіцыі скульптур беларускіх аўтараў. Гэта значная культурная акцыя арганізавана Пасольствам Беларусі ў Літве сумесна з літоўскім Сеймам.

www.mfa.gov.by

Скандал на Беласточчыне

Самаўрадавыя выбары ў Польшчы прыцягнулі ўвагу таксама лукашэнкаўскай прэсы. Асабліва цікава выбарчыя гульні на Беласточчыне прадставіла „Советская Белоруссия". Сама газета з'яўляецца доказам таго, што хаця ад адзінаццаці гадоў няма Савецкага Саюза, у Рэспубліцы Беларусь працягваюцца ў найлепшым стылі савецкія традыцыі. Газета друкуецца на „общепонятном языке", а мінская інтэлігенцыя называе яе „эсбэ".

Артыкул Ніны Раманавай *Игра в подкидного. Скандал на местных выборах на Белосточчине* („СБ", н-р 248) пачынаецца з інфармацыі, што сітуацыя, у якой адбываюцца выбары „сильно подпортит репутацию государства, стоящего в первых рядах соискателя членства Евросоюза". Акампраметаваць дзяржаву мела дыскрымінацыя грамадзян па нацыянальных прычынах. Пачалася яна ад таго, што Беласточчыну так падзялілі на выбарчыя акругі, каб пазбавіць беларусаў магчымасці выбару сваіх прадстаўнікоў у Сеймік Падляшскага ваяводства. На гэтым канчаецца аналіз фактаў і пачынаецца творчасць савецкага журналіста.

Ніна Раманава піша, што хаця сітуацыя была некарыснай, але яна неўзабаве памянялася, калі пражываючыя на Беласточчыне беларусы, рускія і ўкраінцы аб'ядналіся ў „форум национальных меншинств". Форум стварыў — паводле журналісткі „СБ" — „единую коалицию з Социал-демократической партией и Унией труда". Раманава інфармацыю брала ад Яна Сычэўскага, які быў адначасова членам Форуму і СЛД. Апрача Сычэўскага ў падобнай сітуацыі знаходзілася яшчэ некалькі ветэранаў рэвалюцыйнага руху на Беласточчыне, але не абазначае гэта, што была нейкая кааліцыя. СЛД звычайна прыняў некалькіх царкоўных дзеячаў на свае выбарчыя спіскі. Стваральнікамі форуму былі ў большасці дзеячы, якія лічаць сябе праваслаўнымі палякамі, але чытач „Советской Белоруссии" даведаецца, што на Беласточчыне адным фронтам ідуць беларусы, рускія і ўкраінцы і толькі раскольнікі — беларускія нацыяналісты імкнуцца не дапусціць да ўлады гэты прасавецкі лагер на Беласточчыне.

Раскол учыніў — піша Раманава — „Евгений Вапа, возглавлявший одну из структур форума". Шукаючы прычын расколу пытае: „Абсурд?" і адказвае: „Нет, скорее, тонкая политическая игра". Спасылаючыся на словы Яна Сычэўскага паясняе ў чым заключаецца „игра". Форум выступаць меў за ажыццяўленне добрасуседскіх адносін з Беларуссю, а фракцыя Вапы была супраць такой палітыкі новых самаўрадавых улад Падляшскага ваяводства. „Серьезные аналитики", з якімі гаварыла Раманава (іх прозвішчаў не называе) сказалі: „Раскол спровоцирован для того, чтобы не допустить белорусов из форума во власть. А это значит изолировать те политические силы в Польше, которые выступают за сближение с нашей страной".

Прачытаўшы да канца артыкул, праверыў я дату выдання газеты. Напісана: „25 октября 2002 г". Чытаючы яго ў мяне склалася ўражанне, што перада мною тэкст з 1952 г. Ёсць там і пра польскага рэакцыйнага палітыка Яна Новака-Езяранскага, які пасля вяртання з Амерыкі „сразу же занялся белорусским вопросом". Чытачу „СБ" не будзе цяжка ўявіць, што на Беласточчыне сітуацыя падобная як і ў Беларусі. Добрыя беларусы, разам з рускімі і ўкраінцамі, змагаюцца за дэмакратыю і цеснае супрацоўніцтва з самай дэмакратычнай партыяй у Польшчы і самай дэмакратычнай краінай у Еўропе — Рэспублікай Беларусь. Але ёсць і беларусы-раскольнікі, якія сустракаюцца з Янам Новакам-Езяранскім і няспынна думаюць як пашкодзіць Беларусі і „не допустить белорусов из форума во власть". Прыблізна ў такім стылі кожнага дня „СБ" інфармуе грамадзян Беларусі пра падзеі ў краіне і свеце.

Пры канцы васьмідзесятых гадоў у Сярэдняй і Усходняй Еўропе праходзілі вялікія змены, толькі ў Савецкай Беларусі час чамусьці затрымаўся.

Яўген Мірановіч

Будуем масты ўзаемнасці

У Гродне прайшла ўжо 10-я па ліку канферэнцыя „Шлях да ўзаемнасці". Яе арганізатарамі на працягу ўсіх гадоў выступаюць Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Польшчы і Саюз палякаў Беларусі. Гэтым разам да арганізацыі далучыліся Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў РБ, а таксама Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт.

Адметнасцю канферэнцыі стала тое, што ў ёй узялі ўдзел аж 85 навукоўцаў з Польшчы, Беларусі і Літвы, а таксама прадстаўнікі консульстваў Беларусі ў Беластоку і Польшчы ў Гродне, прадстаўнікі ўлады Гродзенскай вобласці і Падляшскага ваяводства. Падчас пленарнага пасяджэння выступілі старшыня БГКТ Ян Сычэўскі і Саюза палякаў Беларусі Тадэвуш Кручкоўскі. Сычэўскі распавядаў пра гісторыю мінулых канферэнцый, зазначыў пра іх неацанімы ўклад у развіццё стасункаў паміж беларускай меншасцю ў Польшчы і польскай у Беларусі.

Тадэвуш Кручкоўскі прысвяціў свой даклад праблемам польскай меншасці ў Беларусі. У прыватнасці ён зазначыў, што ў Канстытуцыі Беларусі дэкларуюцца правы для нацыянальных меншасцей, але на справе яны не выконваюцца. Ён заявіў: афіцыйна лічыцца, што палякаў у Беларусі 400 тысяч, але „мы ведаем, што нас болей".

Напярэдадні канферэнцыі на галоўнай управе Саюза палякаў узнімалася пытанне аб недаверы спадару Кручкоўскаму. Аднак ён не дапусціў, каб адбылося галасаванне. Наогул, астатнім часам у СПБ адбываюцца нейкія дзіўныя рэчы. Аб гэтым сведчыць і нядаўняя публікацыя ў адной з самых буйных польскіх газет „Rzeczpospolita", у якой спадар Кручкоўскі абвінавачваецца ў хабарніцтве.

Што датычыць навукоўцаў, якія з'ехаліся на канферэнцыю, то яны зазначылі цікавую асаблівасць: гісторыкаў разбілі на дзве секцыі, прычым, не храналагічна і такім чынам, каб яны не маглі сумесна дыскутаваць па самых вострых пытаннях. Удзельнічаць у канферэнцыі адмовіўся гродзенскі гісторык Алесь Смалянчук — спецыяліст па беларуска-польскіх дачыненнях. Летась ён выступіў з дакладам у Беластоку, але пераканаўся, што мерапрыемства ігнаруе Беларускі саюз у Польшчы і аўтарытэтныя гісторыкі. Ігнаруюць, бо яго арганізатар, Беларускае грамадска-культурнае таварыства, падтрымлівае рэжым Лукашэнкі.

У пятніцу пасяджэнне канферэнцыі адбывалася ў Навагрудку і Мірскім замку. (...)

М. Мікалайчык, Р. Паўлаў
„Биржа информации", 31.10.2002 г.

Пленум ГП БГКТ

Пленарнае пасяджэнне Галоўнага праўлення БГКТ, якое было спалучанае з адкрыццём культурна-асветнага 2002/2003 года, адбылося 20 кастрычніка г.г. у Беластоку. Старшыня ГП Ян Сычэўскі сардэчна прывітаў дастойных гасцей у асобах консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Аляксандра Карачуна і куратара асветы Зофіі Транцыгер-Кочук. Затым было сумнае паведамленне: „15 верасня Аляксандр Раманюк, член калектыву „Хлопцы-рыбалоўцы" з Рыбалаў выступаў на дажынкавым фэсце, а назаўтра, 16 верасня, раптоўна памёр. Ушануйма памяць аб ім". І ўсе ўсталі і магчыма стараліся ўспомніць выгляд пакойнага, які разам з калектывам расслаўляў беларускую песню.

Затым сакратар ГП Валянціна Ласкевіч падвяла вынікі дзейнасці ГП у летнім сезоне 2002 г. і намеціла план важнейшых мерапрыемстваў на 2003 год. Адзначыла яна, што ранг беларускіх народных фэстаў падносяць выступленні мастацкіх калектываў з Беларусі. У летні сезон больш 20 розных гуртоў выступіла больш за 60 разоў на мерапрыемствах, суарганізатарам якіх было ГП. У гэтай справе дапамогу БГКТ аказвае консульства РБ у Беластоку, якому была выказана шчырая падзяка. На мерапрыемствы з беларускай песняй заўсёды прыбывае многа людзей. Набралі ўжо папулярнасці „Сяброўская бяседа" ў Гарадку і „Музычныя дыялогі" ў Мельніку. Але найбольш мнагалюднымі былі ў гэтым годзе „Свята беларускай культуры" ў беластоцкім амфітэатры, на якое прыбыло каля 5 тысяч беластачан і „Купалле" ў Белавежы з удзелам найлепшых беларускіх гуртоў Беласточчыны і дасканалых калектываў з-за мяжы.

У новым культурна-асветным годзе будуць працягвацца гэтыя ж мерапрыемствы ў паасобных мясцовасцях, бо яны карыстаюцца грамадскім запатрабаваннем.

У дыскусіі выступілі Ала Каменская, Ян Зенюк, Міхась Голуб, Уладзімір Юзвюк, Кастусь Масальскі, праф. Міхась Кандрацюк, Міхась Хмялеўскі, Павел Лемеш і Ян Сычэўскі. Дзейнасць БГКТ у летнім перыядзе была высока ацэнена і адобрана.

Былі закіды ў адрас СМІ, якія і мала, і неадпаведна асвятлялі згаданыя мерапрыемствы. А ўсё гэта таму, лічыць кіраўніцтва БГКТ, што ўся прапаганда знаходзіцца ў руках іх непрыхільнікаў. Хаця БГКТ недафінансаванае, аднак скромнымі сродкамі арганізуе найбольшыя, мнагалюдныя мерапрыемствы, якія карыстаюцца вялікім зацікаўленнем і грамадскім запатрабаваннем насельніцтва Беласточчыны.

Другі пункт пасяджэння датычыў „Стану беларускай асветы і праблемы навучання беларускай мовы ў школах Беласточчыны". Абшырную і змястоўную справаздачу ў гэтай справе прадставіла куратар асветы Зофія Транцыгер-Кочук. Паінфармавала яна, што ў 25 падставовых школах беларускай мове навучаецца 1 830 вучняў, у 13 гімназіях — 1 054 вучні і 2 ліцэях — 848 асоб.

У некаторых школах у беларускіх асяроддзях далёка недастатковая колькасць навучэнцаў роднай мовы, між іншым, у Гарадку, Нараўцы і асабліва ў Беластоку і на Сакольшчыне. Лёс навучання беларускай мовы ў школах знаходзіцца ў руках бацькоў і толькі часткова ў руках настаўнікаў ці дырэктараў школ. Неабходная ў гэтай справе праца з бацькамі. У дыскусіі над гэтым пунктам выступілі Ян Зенюк, Віктар Швед, праф. Міхась Кандрацюк, Мікалай Нікалаюк і Валянціна Ласкевіч.

Апошнім пунктам пленума былі справы звязаныя з выбарчай кампаніяй у самаўрады.

Міхась Хмялеўскі

Дзень пасля выбараў

Закончыліся выбарчыя эмоцыі. У Чаромхаўскай гміне, напрыклад, удзельнічала 57,4% насельніцтва, якое мела права выбару войта і радных. На пасаду 15 дэпутатаў дзевятнаццаць выбарчых камітэтаў прад'явіла 63 кандыдаты. На войта балаціраваліся трое кандыдатаў. Выбары ў Чаромсе праходзілі спакойна.

Найбольшую колькасць, бо 999 галасоў атрымаў Выбарчы камітэт „Сукцэс", што ў агульным падліку складае 56,29%. Адпаведна да гэтага: каліцыя СЛД і УП атрымала 962 галасы (54,29%) і Выбарчы камітэт пенсіянераў — 336 галасоў (18,96%). На Беларуска-народны выбарчы камітэт аддалі голас 194 выбаршчыкі (10,95%).

Састаў радных чаромхаўскай Рады гміны паказвае, што ўсяго пецярых дэпутатаў паўторна атрымалі давер выбаршчыкаў. Дзесяць апошніх, гэта навічкі. Узрост чаромхаўскіх дэпутатаў разнародны — ад 65 гадоў да 28. Пераважаюць мужчыны — адзінаццаць; жанчыны — чатыры. Характэрнай з'явай сёлетніх выбараў з'яўляецца тое, што ў Чаромсе-Станцыі перамаглі навічкі. У 1-ай акрузе найбольшым даверам абдарылі выбаршчыкі чыгуначніка Яўгена Тыханюка — 143 галасы, ад 2-ой — Янку Купрыцюка — 179 галасоў.

Войт Міхал Врублеўскі выйграў выбары ў першым туры. Набраў 1 240 галасоў (57,4%). Ягоныя сапернікі адпаведна: Лявон Селях — 400 галасоў (22,3%), а Зыгмунт Кастоўскі — 157 галасоў (8,7%).

Карыстаючыся ветлівасцю войта, заходзім у ягоны кабінет. Да нашай кампаніі неўзабаве далучыў Мікалай Міхалюк, былы дырэктар Пачатковай школы, які кандыдаваў са спіска левых дэмакратаў на дэпутата Рады павета. Абрываюцца званкі ў кабінеце. Гаспадар гміны раз прымае віншаванні з прычыны паўторнага выбару, іншым разам паясняе, што Гмінная камісія яшчэ працуе і на вынікі трэба пачакаць. Калі чарговы раз войт падняў трубку і прымаў віншаванні ад віцэстарасты Ежы Сірака, Мікалай Міхалюк ціхенька загаварыў:

— Папытай, ці я перайшоў.

А калі закончылася размова, дык Врублеўскі з усмешкай заявіў:

— Прымай віншаванні. Значыцца, Міхалюк перамог контркандыдатаў з Кляшчэлеўскай і Дубіцкай гмін.

— Шкада, што многія з даўнейшых радных не прайшлі ў галасаванні. З некаторымі новымі цяжка будзе працаваць, — канстатуе войт. — Але, што ж, такая воля народа.

Як будзе складвацца супрацоўніцтва войта з нববыбранай Радай пакажа час. Асноўная справа, каб было ўзаемнае зразуменне абодвух бакоў.

Уладзімір Сідарук

Фота Аляксея Мароза

Кандыдаты БНВК (справа): Міхась Голуб, Міхась Андрасюк, Мікола Еўдасюк і Пётр Карпюк у памяшканні Беларускага саюза

Паказалі, што можна перамагчы

Беларуска-народны выбарчы камітэт увёў на Гайнаўшчыне ў гмінныя самаўрады больш радных, чым чатыры гады таму. Кандыдаты ад БНВК з Чыжоўскай гміны паказалі, што можна перамагчы, калі многа папрацаваць перад выбарамі. 27 кастрычніка войтам Чыжоўскай гміны абраны быў кандыдат ад БНВК Юрка Васілюк, а большасць радных у гэтай гміне саставілі кандыдаты беларускага камітэта. Героямі БНВК сталі выбраныя павятовымі раднымі Міраслаў Раманюк, на якога галасавала 799 асоб і Славамір Кулік, які сабраў у гміне Дубічы-Царкоўныя больш галасоў, чым усе кандыдаты ад СЛД-УП. Па 5 кандыдатаў БНВК увайшло ў раду Гайнаўкі і Гайнаўскага павета.

У гэтым годзе першы раз жыхары Гайнаўшчыны выбіралі непасрэдна бурмістраў і войтаў. У галасаванні перамог актуальны бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк (СЛД-УП), на якога галасавалі 4 670 жыхароў (54%). На другім месцы апынуўся Рышард Сакалоўскі з камітэта „Нашае Падляшша" (1 477), а на трэцім Славамір Касідла з камітэта „Гайнаўская зямля" (1 165). На Міколу Бушко („Твой горад") галасавалі 699 асоб, а на Марка Шчэрбу з „Гайнаўскага пагаднення правіцы" — 639 чалавек.

У Чыжоўскай гміне на Юрку Васілюка ад БНВК галасавалі звыш 800 асоб, а на кандыдата СЛД-УП Яна Лабузінскага звыш 600 асоб. У 15-асабовую раду Чыжоўскай гміны ўвайшлі 8 кандыдатаў ад БНВК: Міраслаў Яканюк з Асоўкі, Славамір Франкоўскі з Койлаў, Яўген Гаўрылюк з Курашава, Валянціна Якімюк з Падрэчан, Васіль Галёнка і Барбара Якімюк з Чыжоў, Славамір Галёнка са Збуча і Анатоль Ільяшук з Кленікаў.

У Белавежскай гміне жыхары абралі войтам Анну Байко, якая правіла гмінай перад Станіславам Куявякам. У іншых гмінах Гайнаўшчыны перамаглі бурмістр Кляшчэляў і войты, якія кіравалі гміннымі ўправамі ў апошняй кадэнцыі.

На Гайнаўшчыне да выбараў прыступілі 9 камітэтаў. У 17-асабовай радзе Гайнаўскага павета апынулася 10 радных ад СЛД-УП. Правая групоўка „Нашае Падляшша" ўвяла ў раду толькі 2 асобы. Хаця на БНВК у Гайнаўцы галасавалі звыш 1 200 асоб, то ўдалося ўвесці ім з горада толькі аднаго павятовага раднага. Стаў ім Міхась Андрасюк. Лепш атрымалася па-за Гайнаўкай, дзе на 9 месцаў ажно 4 занялі кандыдаты Беларуска-народнага камітэта: Міраслаў Раманюк, Славамір Кулік, Мікола Яноўскі і Яраслаў Стоцкі. Найбольш жыхароў Гайнаўкі галасавалі на СЛД-УП (34%), які атрымаў ажно 10 месцаў у 21-асабовай Гайнаўскай радзе. 5 мандатаў здабылі кандыдаты БНВК (20% галасоў): Міраслаў Мордань, Мікола Галёнка, Яўген Сачко, Пётр Маркевіч і Яўген Янчук, 3 радных увяло „Нашае Падляшша" (15% галасоў), 2 радных увайшло ад камітэта „Твой горад" (11% галасоў) і 1 радны быў выбраны ад „Гайнаўскага пагаднення правіцы" (7% галасоў).

У БНВК было мала сродкаў на правядзенне выбарчай кампаніі, але іх плакаты і лістоўкі пра кандыдатаў былі выкананы на добрым узроўні. Многа папрацаваў Міхась Андрасюк, які ў перадвыбарчы час ад раніцы да ночы дзяжурыў у памяшканні Беларускага саюза і друкаваў інфармацыйныя матэрыялы (амаль 20 тысяч старонак). Большасць матэрыялаў апрацаваў Славамір Чыквін, а Яўген Сачко арганізаваў сустрэчы і наглядаў за супрацоўніцтвам з тэлебачаннем. Многа працавалі Міхась Голуб, Яўген Янчук і астатнія члены ўправы БНВК.

Аляксей Мароз

Пасяджэнне праўлення Беластоцкага аддзела БГКТ

17 кастрычніка г.г. адбылося пасяджэнне Беластоцкага павятовага праўленння аддзела Беларускага таварыства, у склад якога ўваходзіць і былы гарадскі аддзел БГКТ.

Першым пунктам павесткі дня была інфармацыя старшыні праўлення Валянціны Ласкевіч аб рэалізацыі плана дзейнасці ў летнім перыядзе. Была гэта частка мерапрыемстваў Галоўнага праўлення, у выкананне якога ўключаўся павятовы аддзел. Былі імі: мнагалюдная „Сяброўская бяседа" ў Гарадку, фэсты ў Заблудаве, Бандарах, Залуках і Рыбалах, дзе спалучаны яны былі з дажынкамі, а ў Войшках (гміна Юхнавец) — са святкаваннем 100-ай гадавіны пажарнай каманды. У Беластоку ў летнім сезоне адбылося „Свята беларускай культуры". Ва ўсіх успомненых мерапрыемствах выступалі вакальна-музычныя калектывы з Рэспублікі Беларусь.

Паколькі пасяджэнне адбывалася перад выбарамі ў самаўрады, гэтым справам было прысвечана многа ўвагі.

М. Х.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Замак у Міры. Ад чорнага ходу вядуцца рамонтныя работы.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Чырвона-жоўтыя платы нагадвалі шматкіламетравы вышываны ручнік.

Мір „на зважай”!

Калі раніцай цудоўна і весела — вечарам чакай бяды. Народная мудрасць стала для нас рэальнасцю. Мы ехалі ў Мір паглядзець замак. Быў аўторак, 20 жніўня 2002 года.

За нашымі спінамі вялася нейкая ігра і мы, не скеміўшы ў чым справа, гучна смяяліся. Падобна паводзілі сябе вяскоўцы з-пад Міра — паўтаралася сцэнка: кабеты малююць платы, а мужчыны стаяць з півам у руцэ, жартуюць, рагочуць. Усім смешна, пацешна...

— Наверна, калгас разагналі! — пажартаваў наш шафёр.

Наша кампанія, якой не трэба было пытаць пра дарогу ў Мядзьведку і Паланэчку, таксама смяялася. Шафёр Саша стаў сыпаць анекдотамі. Яго каментар — „Ах, какія вы чудакі!” — адносіўся ўжо да нас усіх.

Вось, як на адлегласць мы знюхалі Мір — мястэчка, дзе ў гарачцы ставілі „пацёмкінскую вёску”.

* * *

Жар ліўся з неба і над мястэчкам Мір узносілася сцяна пылу. Усюды вуркацелі бульдозеры, трахкацелілі трактары, грукацелі грузавікі. Праезд у мястэчка быў закрыты.

— Нельзя, заварочвайце! — крычалі нам міліцыянты. Наш шафёр не здаўся, ён павярнуў на Карэлічы і кругам мы дабраліся да замка. Тут яшчэ больш вуркацела і грукацела. Брыгады рабочых рамантавалі дарогі, чысцілі сажалкі, асфальтавалі вуліцу, ставілі „знаёмыя” нам платы. Здавалася, што ўсе дарожныя сілы краіны былі кінуты ў Мір. Адчувалася нейкая аднадушнасць.

— Да нас „Ён” прыязджае, — кажа сцішка жыхар Міра. Гаворка вядома пра каго — пра Аляксандра Лукашэнку. Будзе ганаровым госцем у час Свята пісьменства. Ёсць адзін клопат: ці паспеюць да 1 верасня. Часу асталося няшмат, а работы хоць адбаўляй. Калі не паспеюць на 1 верасня — тады засвяткуюць 17 верасня. Добрая дата, вуліца 17 верасня ў Міры ёсць. Прыязджайце да нас, не мінайце.

Дзядзька не меў сумненняў, каб запрашаць нас, грамадзян Польшчы, на Свята 17 верасня — з яго сэрца, як тая жара з неба, лілося шчырае запрашэнне.

* * *

Замак у Міры ад уваходу адноўлены, ад чорнага ходу вядуцца рамонтныя працы. Від замка станоўча ўражвае. У ліпені Мір наведаў сам прэзідэнт ЮНЕСКА. На сцяне дзве табліцы: *Замкавы комплекс Мір. Уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў 2000 г., як выдатны ўзор цэнтральна-еўрапейскага замка і адлюстраванне значных гістарычных падзей і культурных традыцый.*

Цікавая дэталь — надпісы тут на беларускай, французскай і англійскай мовах. Адсутнасць рускай мовы палічылі мы як знак часу.

Іншы прызнак сучаснасці і, здаецца, патрабаванне спонсараў, гэта сучасная прыбіральня. Як сказалі нам — гэта самы сучасны туалет у Беларусі. Пабудаваны таксама пад Свята пісьменства. На жаль, у час нашай тут пабыўкі немагчыма было пакарыстацца прыбіральняй. Старэнькі мураваны туалет, вядомы ў народзе як „нужнік”, стаяў зачынены. Вакол замка працавалі сотні рабочых.

* * *

— Кожны, хто нап’ецца, памаладзее на гады два, — захвальваў ваду з замкавага калодзежа працаўнік музея. Мы, як „старэйшая моладзь”, кінуліся піць „цудадзейную” ваду. Нашы хлопцы пілі проста з вядра — як коні. Пазней, у Ішкалдзі, нам сказалі жахлівую вестку...

Але найперш пра наш слоўнік, які з часам пачаў дзейнічаць як код. У Гродне мы хацелі зрабіць фотаздымак сімпатычнаму выпівоху:

— *Вы мяне падставіць хочаце?* — пакрыўдзіўся дзядзька і захіліў сабе вочы рукавом. Мы не ведалі ў чым справа, а Юрась хіхатаў, аж заходзіўся.

— Гэта слэнг, — паясніў Юрка. — „Падставіць” — значыць: *sprowokować i oddać w ręce milicji* або *zrobić na szaro*, — тлумачыў на крэсавай пальшчызне.

У Ішкалдзі мы даведаліся, што вада ў замкавым калодзежы апаганена. У 1919 годзе, калі ўпершыню прыйшлі бальшавікі, забілі ксяндза, адсяклі галаву і кінулі ў калодзеж, той самы, з якога сёння частуюць легендай.

— Ну і падставіў нас музейнік! — па спіне прабеглі нам дрыжкі. Крыўдна было за сябе і іншых наіўных энтузіястаў, што дарма захацелі памаладзець.

Пакуль за „цудадзейную” ваду не бяруць аплаты.

* * *

Ля замка мы сустрэлі Віктара Пагараноўскага, дырэктара Мастацкага музея ў Мінску.

— Будзе кірмаш, рыцарскія турніры, фотавыстаўка „Замкі Беларусі”, — кінуў на ходу. — Прыязджайце!

Усе спяшаліся і нам здавалася, што перашкаджаем у гарачых падрыхтоўках.

Мястэчка прывітала нас „пацёмкінскай вёскай”. У цэлым Міры стаялі чырвона-жоўтыя платы. Яны загароджвалі старыя брамы.

— Да 1 або 17 верасня ніхто не мае тут права выязджаць машынай ці фурманкай на вуліцу? — гадалі мы ў голас. Чырвона-жоўтыя платы нагадвалі шматкіламетравы вышываны ручнік, пастаўлены па абодвух баках вуліцы дубам. Платы-ручнікі паспелі абрасці ўжо пылам; якраз сарвалі брук, каб пакласці асфальт. Здавалася, што ў кожны час можна іх згарнуць у рулон і перавезці ў іншае мястэчка.

Пасля пісала прэса, што Свята пісьменства адбылося як меркавалі — 1 верасня. З’ехаліся госці і пісьменнікі з усёй краіны. Прыехаў мітрапаліт Філарэт. Народ маліўся, гуляў, слухаў фальклорныя спевы. Літаратары чыталі творы. На ражнах смажыліся парасяты, казляняты, авечкі, публіка выпіла возера піва. Местачкоўцы, якім пакінулі платы, хвалілі Свята пісьменства.

На Свяце пісьменства ў Міры не было ні аднаго незалежнага выдання. Ці нехта адчуваў сябе падведзеным з гэтай прычыны?

Была большая прычына для слёз — не з’явіўся найважнейшы госць.

Аляксандр Лукашэнка не прыехаў.

Ганна Кандрацюк

„Інтэрна ў практыцы сямейнага лекара і спецыяліста”

Лекар ад усяго

У Беластоку (19 карстрычніка, у новай канферэнц-зале гатэля „Галэмбеўскі”) праводзілася вубэчная канферэнцыя для каля трохсот сямейных лекараў. Даклады вялі вядомыя спецыялісты з клінік Беластоцкай медыцынскай акадэміі. Краналіся тэмы дыягназу і лячэння туберкулёзу лёгкіх (сухоты далей ёсць пагрозай), хвароб стрававальнага шляху, астмы, нырак, кардыялагічных захворванняў, а таксама псіхічных хвароб (расстройствы звязаныя з перапудамі). Ад сямейнага лекара, медыка „першага кантакту” найчасцей залежыць правільны дыягназ ды накіраванне на адпаведнае лячэнне пацыента. Як сказаў прафесар Міхал Мыслівец з Клінікі нефралогіі, навуковы арганізатар канферэнцыі, сямейны лекар павінен ведаць усё, разбірацца ва ўсім. Ад яго ведаў і немалаважнай інтуіцыі залежаць вынікі далейшага лячэння. Сустрэчы такога тыпу (а была гэта ўжо дзевятая навукова-вучэбная канферэнцыя) вельмі спрыяюць інфармацыі, абмену навінкамі, тлумачэннем сумненняў.

„Медыцына гэта каханка памылак”, — заўважыла прафесар Іда Кінальская, эндакрынолаг, цытуючы філосафа Плотына. Прадстаўляючы канкрэтныя памылкі ў дзеянні сямейных лекараў (брала яна пад увагу вопыт шмат якіх супрацоўнікаў) у адносінах да эндакрыналагічных захворванняў, заўважыла, што „лячэнне не можа быць горшым ад хваробы”. Мяне, прафана ў медыцыне (хоць, мабыць, крыху ў гэтым разбіраюся) ды патэнцыяльнага пацыента, спалохаў даклад прафесар Кінальскай, хоць зацікавіў не менш чым іншыя. Спецыялісты ў той час пільна рабілі нататкі, каб не памыліцца ў падобных сітуацыях. А якія памылкі могуць трапіцца? Памылкі ў дыягназе, неправядзенне роспытаў пацыента, памылковая інтэрпрэтацыя дадатковых доследаў... Напрыклад, лекар, даследуючы звычайную паўнату не падазраваў хваробы Кустынга. У гэтай хваробе паўната звычайная прыкмета, ды пры заніку мускулаў, чырвоных плямах на твары, вуграватасці, дэпрэсіі... Часам без кансультацыі з эндакрынолагам лекар адпраўляе пацыента на аперацыю. Найбольш памылак трапляецца ў выпадку шчытападобнай залозы (tarczycy). Лечыцца захворванні сэрца, пры яе гіпертырэозе (nadczynności). Славуты быў дыягназ хваробы аднаго з былых прэзідэнтаў ЗША, якому прыпісалі ці то хваробу Альцгеймера, ці то памяшанне ў разуменні рэальнасці, а справа была ў ягонай шчытавідцы. Пры гіпатырэозе (niedoczynności) — лячыліся вада ў жываце, комплекс запясця (cieśń). Запаленне шчытавідкі бралі за ангіну і прыпісвалі антыбіётыкі. Пры дыябеце не рабілі ўсе профілі цукру ў крыві...

Але не выказвайцеся занадта пра вашы сумненні ў лекара першага кантакту. Як красамоўна заўважыў доктар Андрэй Чэрнікевіч, з кантакту з пацыентам, які ведае пра свае хваробы быццам бы больш за кожнага доктара ды мае шмат сумненняў наконт таго, ці адпаведна ды паспяхова яго лечыць, можна пазнаць, ці няма ў таго нейкага псіхоза або неўроза. Можа лекар вам тады запрапанаваць візіт у лекара адпаведнага да вашага ляку. А ў нашай краіне, як сказалі на канферэнцыі, 4 мільёны людзей мае праблемы з уласнай душой. А тыя і так у сем разоў часцей карыстаюцца паслугамі службы здароўя.

Міра Лукша

Да 120-годдзя нараджэння беларускіх класікаў

Колас і Купала

Гэтыя славутыя імёны з'яўляюцца гонарам беларускай літаратуры. З імі звязана развіццё нашай культуры, яны заснавальнікі нашай літаратурнай мовы. З песнямі паэтаў мы раслі, дужэлі і сталелі.

М. Жыгоцкі

Вельмі многае збліжала гэтых сыноў беларускага народа: аднагодкі, абое ад зямлі, таленавітыя ад прыроды, поруч ішлі па жыцці.

Пазнаёміўшыся з Купалам праз друкаванае слова, Колас запрасіў яго ў госці на Мікалаеўшчыну (хутар Смольня, дзе дзядзька Антось паставіў дом і апекаваўся сям'ёй брата). У лісце быў апісаны маршрут следавання са Стаўбцоў. Дарога была блытаная і „большай часцю праходзіла лесам з рознымі адгалінненнямі дарог і дарожак управа і ўлева".

Купала заблудзіўся. Не маючы намеру начаваць у лесе, ён успомніў пра Нёман, які павінен быць побач. Дыхнуўшая з ракі вільгаць падказала падарожніку верны шлях. Трапіўшы ў Мікалаеўшчыну, заначаваў тут, каб раніцай без прыгод дабрацца да Смольні.

„Я жыў у сваіх родных на Нёмане, у паўтара кіламетрах ад вёскі Мікалаеўшчына. Якраз на тую пару я быў у сяле ў аднаго з сваіх прыяцеляў. І раптам прыбягае адна з маіх сясцёр. Усхваляваная, стаміўшыся ад шпаркай хады, яна адразу з запалам сказала: «Да цябе прыйшоў Янка Купала!» Гэтыя словы моцна ўразілі мяне. Я зараз жа развітаўся з прыяцелем і хутка падаўся да хаты на сустрэчу з паэтам, якога я ведаў даўно, але ні разу яшчэ не бачыў і якога так моцна хацелася пабачыць.

Купала сядзеў за сталом. Згледзеўшы мяне на парозе хаты, ён, не спяшаючыся, падняўся з месца і накіраваўся насустрач мне. Лагодная ўсмешка, ясны малады твар, вясёлыя светла-карыя вочы з ледзь улоўнай хітравінкай — такі быў у маіх вачах Купала".

Дружбу, як водзіцца, замацавалі за сталом, прыгадваючы свае шляхі-дарогі і перапіску.

„Спярша мы з Купалам страшэнна саромеліся адзін аднаго. Я стыдаўся свайго таннага лапсардачка — Купала ў новым пільчаку выглядаў куды ямчэй. Брыдка было і за пачастунак. Госць з вялікай дарогі, першы раз у хаце, а на стале ў нас як быццам ежы вобмаль.

Саромеўся і Янка. Сядзеў як прыкуты. Еў тое, што стаяла бліжэй, і лішне рукамі не варушыў. Потым ён прызнаўся, што пагнаўся за модным гарнітурам. Купіў і не агледзеўся: рукавы караткаватыя. Я і сам прыкмеціў: пацягнуўся ён дастаць хлеба, а рукаў заехаў на самы локаць.

Праз гэтую сарамяжлівасць мы больш маўчалі і часцей, чым належала, кулялі чаркі. Разгаварыліся, як добра асвойталіся. Радаваліся і бедавалі. Пішам, а для каго? Хто чытаць будзе? На нашай мове школ няма. Што ж ты — адною ці дзвюма беларускімі кніжкамі свет абернеш? Але надзея на перамены была".

Вырашана было трымацца адзін аднаго бліжэй. Падаць руку пры неабходнасці. Падтрымаць словам. І праз увесь час прытрымлівацца сваіх поглядаў.

„Назаўтра я пайшоў Янку праводзіць. Як толькі пачалася лясная дарога, ён разуўся. Тут і высветлілася гісторыя з чаравікамі. (Чаравікі былі новыя і замалыя. Ад доўгай хады Я. К. панамульваў ногі. За сталом сядзеў босы. Устаўшы насустрач Коласу, пераблытаў „хадакі" і ледзь не ўпаў. Т. Л.).

У Свержані мы пабывалі ў гасцях, падмацаваліся. Янка ўсё прабаваў заспяваць песню. Я суцішаў яго, а ён слухаць не хацеў. „Я старэйшы, кажа, я ўжо сваёй маці ўсміхаўся, а ты яшчэ і разу ў калысцы не вякнуў". Тады пачалі спяваць разам.

Пасля першай сустрэчы было прыемна на душы ў абодвух.

Другое спатканне адбылося ў Вільні ў чэрвені 1913 года, куды Колас прыехаў з жонкай да яе сваякоў. Купала ў той час працаваў у „Нашай ніве".

Потым быў перапынак да 1921 года, пакуль Колас не пераехаў на пастаяннае жыхарства ў Мінск.

„Трыццаць гадоў мы з Янкам ведалі адзін аднаго. Дружылі. І сварыліся. Але гэта — толькі ў шахматы гуляючы. Я ведаю пустабайства, з якім пачаў сяды-тады вытыкацца ў кампаніях наш агульны знаёмы. Той-сёй можа падумаць, што паміж мною і Купалам сапраўды ляжала нейкая непрыязнь. І нібыта вынікала яна праз спаборніцтва за першае месца.

Кар'ерызм у літаратуры — гэта асабліва агідна".

Прыемна чытаць пра чалавечыя адносіны гэтых вялікіх людзей. Раіліся, падтрымлівалі адзін аднаго, часам крытыкавалі, дбалі пра адно („каб як мацней народ на ногі стаў"). Але падыход да пісання ў кожнага быў свой. І свой у кожнага быў жыццёвы расклад. У Коласа — добра наладжаны быт, ашчаднасць, цяга да працы — сялянскай, творчай, навуковай.

У Купалы — таварыскасць, святы ў будні, празмерная шчодрасць і творчая праца. „Сяброў сапраўдных не так многа было, а рэшта — так званыя прыхільнікі таленту, ахвотнікі кульнуць чарку. І Янка зводзіў на іх мноства часу".

Аднак, як сцвярджае Я. Колас, дастаткова было толькі сустрэцца з Купалам і прывітацца, „а дзень пройдзе весялей і зробіцца больш. Значыць, ён табе моўчкі паспагадаў, дабра пажадаў. Чалавек заўсёды чуе, што яму другі зычыць у нутрах. Такое зычлівасці Янка меў багата. Не скажа, але ўсё роўна зразумееш, што ён душою хінецца да твае радасці або бяды".

Сябру Колас прысвяціў наступныя творы: казка „Ноч, калі папараць цвіце" (да 20-годдзя літаратурнай дзейнасці), верш „Янку Купалу" (у сувязі з 25-годдзем літ. дзейнасці), публіцыстычныя выступленні па радыё і ў прэсе, а таксама эпіграму „Памыецца Янка ў нарзане...".

7 ліпеня 1942 года на вечары памяці, прысвечаным 60-годдзю Янкі Купалы, Колас чытае верш „Над магілаю друга".

З цёплымі словамі аб сябру выступіў Я. Колас і на адкрыцці помніка Івану Дамінікавічу ў 1949 годзе, і на ўрачыстасцях, прысвечаных 70-годдзю з дня нараджэння.

„Якуб Колас і Янка Купала — гэта наш гонар, радасць, любоў, надзея, сумленне. Напісаныя імі творы ўвайшлі ў залаты фонд беларускай літаратуры" (М. Жыгоцкі).

Тамара Лаўрэнчук, г. Высокае

Юбілей калектыву „Арэшкі"

12 кастрычніка г.г. калектыў „Арэшкі" з Арэшкава адзначаў 30-годдзе мастацкай працы. Мерапрыемства, пад патранатам БГКТ і войта Гайнаўскай гміны, адбывалася ў вясковай святліцы, запоўненай публікай. Ганаровымі гасцямі былі прадстаўнікі кіраўніцтва БГКТ, Ваяводскай управы, Консульства РБ у Беластоку, Гайнаўскага староства, Гміннай управы...

Гасцінна выступілі калектывы з Курашава і Гродна. Сапраўдны паказ сваіх магчымасцей запрэзентавалі Юбіляры — „Арэшкі". Са свайго багатага рэпертуару калектыў праспяваў некалькі песень: „Dziś was drodzy goście", „Я купіў гармонію", „Пасеяла агурочкі", „У нашым садочку", „Там у полі вярба расла", „Там у полі тры крынічанькі".

Юбіляры, з рук віцэ-ваяводы, атрымалі адзнакі „Zasłużony działacz kultury". Валянціна Ласкевіч зачытала віншавальны ліст, у якім ад імя міністра культуры Рэчы Паспалітай Вальдэмара Дамброўскага, між іншым, напісана: „Starannie pielęgnując folklor białoruski, śpiewając piękne pieśni Waszego regionu, przyczyniają się Panie do szerokiej prezentacji bogactwa kultury naszej wspólnej Ojczyzny".

* * *

Калектыў „Арэшкі" паўстаў у 1972 годзе па ініцыятыве Аляксандра Лукашука, настаўніка з Белавежы. Каля двух гадоў з калектывам супрацоўнічаў Янка Крупа, цяпер „Арэшкі" працуюць без інструктара. Калектыў выступаў у Сямятычах, Драгічыне, Сувалках, Пуцку, Варшаве, Сопаце, Пуньску, Гродне. Штогод прымае ўдзел у фэстах і дажынках. За мінулыя 30 гадоў у калектыве выступала 11 асоб; цяпер налічвае ён 6 жанчын: Таццяна Гурын (выступае ад пачатку), Надзея Грушэўская (кіраўнік калектыву), Надзея Грош, Надзея Андрасюк, Ніна Авэрчук і Марыя Скепка — усе з Арэшкава.

Фота з АРХІВА, 1994 г.

* * *

Тыдзень пасля мерапрыемства я правёў гутарку з кіраўніком калектыву Надзеяй Грушэўскай.

— *Якія задачы стаяць перад кіраўніком? Дзеля чаго жанчыны спяваюць? Ці мужы не раўнуюць у час рэпетыцый і даволі частых выездаў калектыву?*

— Мы любім беларускую песню і любім спяваць. І хочам расславіць наш рэгіён, нашу гміну. Я, як кіраўнік, склікаю жанчын на рэпетыцыі перад выездамі на выступленні. Рэпетыцыі, пераважна раз у тыдзень, адбываюцца — калі халоднае надвор'е — у хаце, а летам у святліцы; там ёсць такі пакойчык. У сваім рэпертуары маем больш за дзвесце песень — беларускіх, рускіх, польскіх...

Мужы дазваляюць нам праводзіць рэпетыцыі і выязджаць з канцэртамі, бо яны таксама любяць песні. Няма ў калектыве маладых, бо яны не любяць такіх песень, а мы будзем спяваць дакуль зможам. Радуемся атрыманымі ад міністра адзнакамі і юбілейным мерапрыемствам таксама задаволены.

Міхал Мінцэвіч

Зорка

старонка для дзяцей

Васіль Вітка

Лістапад

Як малое птушанятка,
Перабег лісток дарожку.
Кінуўся за жоўтым статкам,
Мільганулі толькі ножкі.
Закружылі па асфальце
За чародкаю чародка.
Любыя, не адлятайце —
Будзе вырай ваш кароткі.
Зменіцца зіма вясною,
Узляціце зноў на дрэвы.
Зноў шчасліваю парою
Я пачую вашы спевы.

Ноч

Пачынаецца ноч —
вялікая ноч.
Людзі бягуць, спяшаюцца.
Зоркі ўжо на небе
Месяц крочыць па Млечным Шляху
Ноч, ноч, ноч; пачынаецца ўжо ноч.

Аня Артэмюк, VI „в" кл. ПШ у Аўгустове

Фота Ганны Кандрацюк

Сонька Сульжык з мамай і татам на вернісажы Юркі Федарука

Скуль узяліся ў нас бярозы і асіны

Гарачае, ой, якое гарачае было ў нас лета! Людзі абліваліся потам, жывёла хавалася ў кусты ад гарачыні і ад мухаў; нават птушкі змоўклі і драмалі ў цяньку зялёных галінак.

На вузкім загоне жала трое людзей: бацька, маці і дачка. Бацька і маці, хоць пот ліўся цурком з іх твараў, працавалі шчыра, каб толькі зжаць хутчэй сваю ніўку. Але ж дачка не тое: аглядалася, пацягвалася, пастойвала. Відаць, гультайка была добрая. Наракала то на гарачыню, то на мухі; то жалілася, чаму не наляціць цёмная хмарка, чаму дожджык халодны не асвежыць зямлі. Не памаглі ні просьбы маці, ні пагрозы бацькі.

Нарэшце маці, угледзеўшы, што дачка зноў стаіць рукі злажыўшы, не выцерпела, ды са злосці крыкнула:

— Чаго ж ты зноў стаіш? А каб ты стала асінаю!

У дрэнную гадзіну быў кінуты праклён. У моманцік ногі дзяўчыны перамяніліся ў пень, які ўрос у зямлю; рукі выраслі ў паднятыя ў неба галіны, пакрытыя круглаватымі зялёнымі лісточкамі, што так безупынку дрыжэлі, як дрыжэла ў мінуту праклёну цела спалоханай дзяўчыны.

Загаласіла маці, заплакала. Абедзвюма рукамі ўхапілася за галаву, ірве валасы.

Расплялісся косы, слёзы ракой ліюцца.

Спалоханы бацька анямеў на хвіліну, ды і ён як загалосіць:

— А што ж ты нарабіла!.. А долечка мая няшчасная... А каб ты сама бярозаю стала!..

Стаіць маці, рукі апусціўшы. Белая яе вопратка белай карой стала; валасы галінкамі тоненькімі, цёмнымі, бліскучымі да зямлі звешваюцца; як густыя слёзы, дробнае лісце па галінках сплывае. Стала маці бярозаю.

Многа вякоў з таго часу прайшло, а бярозы і асіны развяліся ўсюды па нашай зямлі.

Зорка Верас

Польска-беларуская крыжаванка № 45

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 41: Брыз, мантаж, лагчына, кран, сядло, рот, рок, муж, аптэкар. Зорка, смак, агрэст, ранча, тын, друк, збан, ложа, жаўток.

Узнагароды, **аўтаручкі**, выйгралі: **Ілона Асіпюк**, **Ева Шырэнос**, **Эвеліна Лапінская**, **Аня Анапюк**, **Наталля Ткачук**, **Анна Бурак**, **Раман Лушчынскі** і **Эвеліна Гайко** з Бельска-Падляшскага, Віншуем!

▼	Brat	Obraz / Akrobata	▼	Cis / Pogoda	▼	Magnes	Siłacz	▼ ►			Błękit
	Objęcia ►	▼		▼		▼			Sum	╳	▼
	Piękno ►						Imię chińskie ►			╳	
	Rząd ►				╳		╳		Noga	╳	
Kręgosłup ►									▼		
╳	╳		╳		╳		╳	╳		╳	
►							╳	╳		╳	
Kwadrat	╳		╳		╳	Skarb ►					╳

Вершы Віктара Шведа

Хачу дзетак паслухмяных

Запыталі дзеці маму
Яраслаў, Адась і Жэня:
— Што мець хочаш у праграме
Свайго свята нараджэння?

— Трое дзетак паслухмяных
Хачу мець, сказала маці.
— Тады, мама, нечакана
Будзе нас шасцёра ў хаце.

Дагавор

Тата скардзіцца: — Рыгорка,
Ты не вучышся з ахвотай.
Я за кожную пяцёрку
Гатоў плаціць дзесяць злотых.

Грыша ў класе нечакана
Атрымаць хацеў бы згоду:
— За пяцёрку можа пані
Мець пяць злотых узнагароды.

Фарфоравая лялька

Стаяла на пісьмовым стале
ў белай сукенцы,
а яе позірк быў убіты ў сцяну.
Халодныя шчокі
і белыя як папера далоні
трывалі ў нерухомасці
добрых пару гадоў.
Ды калісь выпадкова
ўпала на цвёрдую падлогу.
Застаўся толькі ўспамін
ад пустых вачэй,
беленькай сукенкі,
бледных нерухомых ручак.
На пару добрых гадоў.

Мартына Леанеўская,
I „а" кл. Гімназіі ў Нараўцы

Гісторыя з катом

У Пілікі прыехала панюся з маленькай дзяўчынкай і персідскім катом. Прыехала яна таму, бо хацела паездзіць на кані. У Пілікі жыве гаспадар, які гадуе коней. Панюся ездзіла, а дзяўчынцы загадала пільнаваць ката. Кот быў вельмі жвавы, бегаў так хутка, што дзяўчынка не паспявала за ім. Кот уцёк! — дзяўчынка ўстрывожана закрычала. Няма ката? — адчайным голасам спытала панюся і заплакала. Быў гэта яе самы любімы кот і яна выдзеліла ўзнагароду таму, хто яго знойдзе. Ахвотных да ўзнагароды было многа. Аднак па сённяшні дзень ніхто яго не знайшоў. Куды дзеўся кот? — пыталі жыхары вёскі. Адна бабуля нават сказала, што за 100 злотых (такая была ўзнагарода) яна магла б купіць сабе новыя боты. Некаторыя гаварылі, што бачылі ката, як бегаў па полі і пэўна лавіў мышэй. Бегае ён і па сённяшні дзень. Шкада толькі дзяўчынкі, плача яна, што загінуў коцік.

Вучань VI „в" класа
Пачатковай школы ў Аўгустове

Дзённік Міколы

Аня — Анечка

Пасля сустрэчы з гангам Лінкаў я баяўся выходзіць з хаты. У наступны дзень не пайшоў у школу. Сядзеў у сваім пакойчыку і думаў пра ўсё незразумелае. Я баяўся Ліняцкіх. Пасля абеду прыйшлі да мяне Томак і Ярак.

— Мікола! — крыкнулі з парога — ці паверыш у такое? Уяві, што Ліняцкія перасяліліся з нашай камяніцы.

— Як перасяліліся! — я аж падскочыў на крэсле.

— Нармалёва! — Томак махнуў рукой, — спакавалі свае манаткі і ад'ехалі ў свой бок.

— Але чаму? — Я не ведаў, што думаць, — яны ж толькі што пасяліліся ў нашай камяніцы.

— Гэта іх справа, — сказаў Томак і даручыў мне ліст. Перадалі яго самі Ліняцкія. Я ўзяў ліст і адчуў, як дрыжаць мае рукі. Хлопцы развіталіся і пайшлі. Я зноў астаўся сам са сваім страхам...

Калі адкрыў ліст — наздзіў — з яго выскачыла Аня.

— І ты тут? — Я здзівіўся і падумаў пра сябе найгоршае. Звар'яцеў Міколка!

— Добры дзень! Гэта я, — заявіла плаксівым голасам Анечка. Так, яна цяпер была Анечка.

— Учора вечарам я яшчэ раз пайшла ў падвал, — Анечка хліпала і ледзь гаварыла, — ну, і Ліняцкія знерваваліся ды паменшылі мяне да размераў ліліпуціка. Ну вось, якая бяда.

Аня плакала і я таксама ледзь стрымоўваў слёзы. Што цяпер будзе? Вось злыдні — зачаравалі дзяўчыну і з'ехалі дзесьці ў чарговы падвал. Я думаў, але галава не працавала і нічога канкрэтнага не прыходзіла на думку.

— А што сказалі бацькі? Ты ж не вярнулася нанач?

Аня загадала мне ўключыць тэлевізар. Якраз аб'явілі камунікат:

Увага, загінула 12-гадовая Анна Ляшчынская. Ужо другія суткі паліцыя нашага ваяводства пастаўлена на ногі. Дзяўчынка выйшла з дому ў сем гадзін вечара да сяброў і не вярнулася нанач. Была апранута ў зялёны швэдрык і чорныя джынсы. Усіх, хто бачыў загінуўшую, просім кантактавацца з паліцыяй.

— І Ліняцкія маглі спакойна сабе перасяліцца? — Я не верыў ужо ў нішто. — Як гэта?

— Так, яны з'ехалі легальна.

— Тады пабягу на паліцыю, — прыдумаў я, — і ўсё ім раскажу.

— Ніхо табе не паверыць. — Анечка зноў пачала плакаць. — Ліняцкія так мяне зачаравалі, што толькі ты адзін можаш мяне бачыць.

— Вось злыдні! — Я падняў Анечку на руцэ і далікатна яе пацалаваў. Відаць, між хваляваннем, жахам і роспаччу мне прыгадалася адна казка (ведаеце якая).

... І Анечка пачала расці, расці, расці... Я глядзеў на ўсё і не верыў у тое, што тварылася перада мною. Мая сяброўка зноў стала нармальнай. Адважнай і вясёлай Аняй Ляшчынскай.

Мы зразу пабеглі да яе бацькоў, і яны доўга распытвалі нас што здарылася? Мы не сказалі ні слова. Уся гісторыя з Ліняцкімі вылецела нам з галавы. Быццам нехта ўзяў і сцёр непатрэбны файл у камп'ютэры.

(працяг будзе)

(нак-с)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Анна Паўлючук, III кл. Гімназіі ў Аўгустове. На конкурсе „Роднае слова" дэкламавала верш Я. Крупенькі „Ёсць у кожнага"

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Урок каля млына

28 верасня г.г. вучні III „б" класа Гімназіі ў Орлі сустрэліся ля старога млына. Настаўніца Яўгенія Тхажэўская, падрыхтавала жывы ўрок беларускай мовы.

Млын над ракой Арлянкай (300 метраў ад школы) стогадовай даўнасці. Да другой сусветнай вайны працаваў на ваду, зараз ён электрычны. Уласнікам млына была сям'я Серацкіх. Прыблізна ў 1924 годзе, у выніку пажару, млын быў зруйнаваны. Аднак яго хутка адбудавалі. Побач збудавалі вялікі дом для некалькіх сем'яў. У 1928 г. Серацкі стаў войтам Орлі, а працай млына стаў кіраваць яго намеснік.

У час апошняй вайны, за саветаў, млын перайшоў на ўласнасць дзяржавы. Кіраваў ім яўрэй Ляцкі. Год пазней, калі сюды прыйшлі немцы, млын заняў камісар Сандэцкі і дазволіў адно малоць жыта, ды тое было пад кантролем.

Пасля вайны млын належыў ГСу (гмінай сялянскай самапомачы). Тады ён працаваў на электраэнергію, рэгулявалі раку. Цяпер млын у прыватных руках. Рэдка працуе на патрэбы мясцовай пякарні, і асабліва прыватным кліентам. У 50-я гады ў Орлю прывозілі малоць збожжа сяляне з Бельскага і Гайнаўскага паветаў. Цяпер, калі людзі купляюць муку ў магазіне, млынарскі фах у заняпадзе.

Пра гісторыю млына распавяла гімназістам настаўніца і аўтар гэтага допісу. Вучні атрымалі літаратуру на тэму арлянскага млына. На заканчэнне ўсе пайшлі над стары яз. Летам тут купаецца моладзь. Усім было цікава ад сустрэчы з помнікамі нашай мінуўшчыны.

У III „б" класе 14 вучняў, з якіх большасць ходзіць на беларускую мову. Сярод іх вылучаюцца Рафал Сельвясюк, Агнешка і Аня Плішка, Крыся Буйнюк. Рафал Сельвясюк і Лукаш Сікора — карэспандэнты „Зоркі" і ўдзельнікі Сустрэч „Зоркі". Апошнія таксама стараюцца.

Міхал Мінцэвіч

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Урачыстая прысяга першакласнікаў гімназіі

12 кастрычніка 2002 года ў Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім адбылася прысяга першых класаў. У гэтай урачыстасці бралі ўдзел вучні першых класаў, школьны самаўрад, настаўнікі, дырэктар, бацюшка і бацькі.

На пачатку дырэктар гаварыў аб вучнёўскіх абавязках і новай школе. Потым вучні далі прысягу. На канец урачыстай часткі вучні атрымалі дыпломы і фатограф зрабіў кожнаму класу здымак. У другой частцы ўрачыстасці былі атрасіны. Кожны вучань апранаўся ў паношанае адзенне, каб не было шкада яго выкінуць. Вучні старэйшых класаў пісалі фламастэрамі на руках першакласнікаў слова „кот", а на твары малявалі вусы. Увесь твар размалёўвалі фарбамі. Іншыя сябры загадвалі з'есці нясмачную сумесь розных страў. Потым на каленях трэба было ісці да фатографа, дзе таксама „пасавалі" на вучня гімназіі. Мы як найхутчэй хацелі памыцца.

На трэцюю частку склалася дыскатэка з рознымі конкурсамі. Урачыстасць закончылася пасля дзевятай гадзіны вечара. Усе задаволеныя і вясёлыя разышліся па дамах.

Марта Федарук, I „ц" кл. Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Прыбіранне свету

Прыбіранне свету адбылося ў чацвер 19 верасня г.г. Наш клас быў адным з удзельнікаў гэтай акцыі, якую арганізавала Альжбета Навацкая — настаўніцай прыроды. На гэты дзень усё было падрыхтавана — рукавіцы, мяшкі на смецце. Быў таксама вялікі энтузіязм і ахвота, неабходныя для такой працы. Спачатку пайшлі мы вуліцай Баторыя, пасля павярнулі на вуліцу Хмельную, дзе было многа працы. Мяшкі напаўняліся смеццем вельмі хутка, таму што тут людзі насмяцілі надта многа. Не інакш было на вуліцы Дубічы. Але і тут наш клас паказаў жыхарам Бельска, як павінна выглядаць асяроддзе, у якім жывем і штодзень прабываем. Вярнуліся мы ў школу крыху стомленыя, але задаволены. Думаю, што наша праца была патрэбнай і дарослыя павінны яе цаніць.

Лукаш Верамяюк, III „ц" кл. Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Сумняваюся, ці прыгажосць збавіць свет

— Карціны Юркі Федарука — новая з'ява ў мастацтве Беластока, — аб'явіла крытыка з нагоды вернісажу выставы „Квадрат метафізычны і іншыя аповеды", якая з 18 кастрычніка працуе ў Ружовай зале галерэі ВААК у Беластоку.

З Юркам ФЕДАРУКОМ гутарыць Ганна Кандрацюк.

— Думаю пра цябе як пра збунтаванага старажытнага іканапісца, якога праследуе патрэба пошукаў, патрэба ісці сучаснай дарогай мастацтва.

— Ікона мае для мяне вялікае значэнне, цяжка ўцячы ад таго, што чалавек вынес з асяроддзя праваслаўнай вёскі. Мой першы кантакт з жывапісам гэта была царква і іконы.

— Адважна спалучаеш свет іконы са светам сучаснага, напрыклад, фігуратыўнага мастацтва. Гэта можа ўяўляцца як правакацыя?

— Менавіта.

— Ёсць пэўны эфект ілюзіі, глядзіш на карціну, і хочаш, каб там была ікона. Так думаю пра карціну святога Юрыя. У цябе ён — без арэола?

— Мае карціны, абсалютна, не з'яўляюцца іконамі. Можа, спосаб кладзення фарбы, або кампазіцыя, якая фактычна запазычана з іконы, могуць такое ўнушаць. Мяркую, што кожны мастак думае пра свой твор як пра ікону.

— Думаеш і малюеш як Ежы Навасельскі?

— Навасельскі мне падабаецца.

— Хто яшчэ?

— Бош, Брэйгель, і асабліва, Вермеер. Фламандскае і нідэрландскае мастацтва лічу самым дасканалым.

— Загаловак тваёй выстаўкі: „Квадрат метафізычны і іншыя аповеды".

— Мае карціны маюць сувязь з літаратурай, музыкай. Квадрат ёсць формай, іконай, якая дазваляе пабачыць і адчуць іншы свет.

— Раскажы пра свет, у якім ты вырастаў.

— Я родам з Рыбалаў. Бацькі земляробы, але яны выхавалі нас, мяне і сястру, у пашане да мастацтва. Бацькі намовілі мяне прыняць удзел у мастацкім конкурсе арганізаваным Багданам Мартынюком з Таварыства апекі над помнікамі царкоўнага мастацтва. Я атрымаў там вылучэнне. Кожны год ездзіў на Лэмкаўшчыну, дзе на працягу двух тыдняў адбываліся мастацкія пленэры. Хачу яшчэ адзначыць, што ў пачатковай школе да мастацтва схіляў нас не хто іншы, як айцец Рыгор Сасна. Ён даў нам магчымасць удзельнічаць у мастацкіх сустрэчах, знаёміцца з людзьмі творчага асяроддзя.

Пасля вучыўся ў бельскім белліцэі і тады хадзіў на сустрэчы гуртка іканапісцаў, бо яшчэ не было Іканапіснай школы.

— Пасля была Акадэмія мастацтваў у Мінску.

— Я закончыў Факультэт прыкладнога мастацтва, у канкрэтнасці — інтэр'ер і мэблевае абсталяванне.

— Гэта больш бізнесовы кірунак?

— Можна жыць з гэтай працы. Працую ў прыватнай фірме праектантам.

— Зарабляеш грошы, каб маляваць карціны?

— Так, каб маляваць.

— Жывапіс — хобі ці патрэба?

— Патрэба. Патрэба, якая не заўсёды бывае прыемнай. Маю на думцы змаганне з матэрыяй, сумненні, страх.

— Адкрываеш сябе?

— Больш падыходзіць слова „шукаю".

— Які ў цябе творчы працэс?

— Не ведаю як гэта ўсё дзеецца — цяжка сказаць, неяк само па сабе.

— Творчы момант — ён вынік тваёй працы ці, проста, натхнення?

— Можа дзве або тры карціны мне намаляваліся лёгка, але іншыя каштуюць многа часу, часам год ці больш. Чакаюць, аж пэўныя дэталі даспеюць у часе. Калі малюю, мушу быць адзін, не ўяўляю, каб нехта быў побач са мною.

— „Прыгажосць збавіць свет" — фраза Дастаеўскага, якую паўтараюць з нагоды тваёй выстаўкі.

— Гэтыя словы я стаўлю як пытанне. На сённяшні дзень я не ўпэўнены, што прыгожасць збавіць свет.

— Адкуль твой песімізм?

— Бачу, як вымяраюць нашы вёскі і як лёгка асімілюецца беларусы ў гарадах.

— Працы, якія паказаны на выстаўцы, разам 34 карціны, выяўляюць разнавідныя прыклады стылю, уплываў.

— Гэта адлюстраванне пэўнага этапу, плён, які ўзнік у 1998-2002 гадах. І гэта, думаю, ужо пройдзены этап. Цяпер хачу ісці ў іншым кірунку...

— У якім?

— Ёсць думкі, аднак, зарана аб іх гаварыць.

PS. Выстаўка працуе да 15 лістапада г.г., ВААК, Беласток, вул. Кілінскага, 8.

„Грэцыя далёкая і блізкая"

Музей у Студзіводах, уладальнікам якога з'яўляецца Дарафей Фіёнік, у нядзелю 20 кастрычніка зноў запоўніўся жыхарамі Бельска і Студзіводаў. Прычынай для спаткання было адкрыццё фотавыстаўкі „Грэцыя — далёкая і блізкая" аўтарства Хрыстафора Глівы.

Вернісаж пачаўся з выступлення Дарафея Фіёніка, які прадставіў самога аўтара фатаграфій і растлумачыў адкуль узялося названне выстаўкі.

Грэцыя — краіна для большасці нас геаграфічна недаступная, з'яўляецца нам далёкай, але блізкай па праваслаўным веравызнанні, па ўсходняй традыцыі.

Мэтай паездак Хрыстафора Глівы было пазнанне скарбніцы праваслаўнай духоўнасці. Падарожжаў было некалькі. Першы раз, у 1996 годзе разам з „Сіндэсмасам", аўтар трапіў у Грэцыю, потым у 1997 і 1998 гадах прабываў на Афоне, а ў 1998 годзе пазнаваў харастаство Іерусаліма. І з гэтых паездак нарадзіліся цудоўныя фатаграфіі, якія маем магчымасць аглядаць у музеі. Усіх фатаграфій пад 500, але на выстаўцы прадстаўлены, па словах аўтара, найцікавейшыя, якія найлепш паказваюць спецыфіку наведаных ім месц.

Хрыстафор Гліва паказаў спецыфіку Афона, „дзе жыццё выглядае зусім інакш, дзе няма часу і прасторы, а дзень пачынаецца ад захаду сонца". І ўдалося яму гэта вельмі добра.

У планах аўтара выстаўкі ёсць яшчэ падарожжа ў Грузію, на якое трэба будзе яшчэ пачакаць па фінансавых прычынах. Ёсць, аднак, надзея супольнага выезду разам з Д. Фіёнікам на Палессе і ў Сербію — аб чым марыць Хрыстафор Гліва, абяцаючы адразу, што і з гэтых падарожжаў прывязе калекцыю фатаграфій.

Фота ПАЎЛІНЫ ШАФРАН

Музей Дарафея Фіёніка — гэта спецыфічнае месца, дзе мінулае і традыцыя, як і стаўленне ўладальніка да гасцей прыемна здзіўляе і заахвочвае да частых наведванняў.

Паўліна Шафран

Выступаюць абрадавыя калектывы

У памяшканні Галоўнага праўлення БГКТ у Беластоку па суботах, а часам і нядзелях, адбываюцца цікавыя мерапрыемствы. Выступалі тут харавыя ансамблі з Беларусі і некаторыя абрадавыя беларускія калектывы Беласточчыны. Агляд абрадавых калектываў адбыўся ў маі ў Гарадку. ГП БГКТ вырашыла тады паказаць такую форму мастацтва беластачанам, сімпатыкам БГКТ, бо шкада, каб праца самадзейнікаў паказана была публіцы толькі адзін раз.

20 кастрычніка на БГКТоўскай сцэне выступілі чатыры абрадавыя калектывы. Харавы калектыў „Цаглінкі" са Старога Ляўкова пад мастацкім кіраўніцтвам Мікалая Мяжэннага падрыхтаваў сцэнку „Заручыны", паводле колішніх абычаяў. Міхась са сватам прыехаў да Алёнкі. Вядзецца размова свата з бацькамі аб пасагу, Алёнка згаджаецца быць жонкаю Міхася. На стале паяўляецца гарэлка, закуска, адбываецца заручынскі пачастунак. Някепска была ўзноўлена сцэнка старога звычаю. Пасля „Цаглінкі" прыгожа спявалі беларускія песні са свайго рэпертуару.

* * *

Мастацкі гурт „Красуні" з Краснага Сяла працуе пад кіраўніцтвам Валянціны Марціновіч. Жанчыны падрыхтавалі сцэнку святкавання „Юр'я". У гэты дзень распачыналася пасвенне кароў, якіх трэба было дакрануць вербачкай. Сяляне абыходзілі свае палі. Жанчыны ў гэты дзень рыхтавалі караваі. „Красуні" праспявалі таксама некалькі беларускіх песень.

* * *

Калектыў „Крыўчанкі" з Крыўца, што ў Нарваўскай гміне, паказаў колішнія „Вячоркі", у час якіх пралі кудзелю, вязалі на прутках, спявалі, жартавалі, расказвалі пра сваё жыццё-быццё. Выступілі шэсць жанчын і адзін мужчына. Ён з адной з кудзельніц расказвалі анекдоты, а прысутныя ў зале гледачы раскошна смяяліся. Падрыхтавала сцэнку Люба Зубко. Пасля жанчыны спявалі рускія песні, а сыходзячы са сцэны частавалі гледачоў пляцкамі.

* * *

На канец выступілі „Тыневічанкі" з Тыневіч-Вялікіх, Нарваўскай гміны. „Няма горшай кары, калі чалавек без пары", — гаварыла адна жанчына з калектыву. Сцэнка прадстаўляла шуканне сабе пары і называлася „Заручыны". Ролю бацькі выдатна сыграла Валянціна Франкоўская — мастацкі кіраўнік калектыву. Ніхто не дадумаўся, што гэта жанчына, але рассакрэціла яе Валянціна Ласкевіч, калі дзякавала калектыву. „Тыневічанкі" таксама праспявалі некалькі рускіх і беларускіх песень.

Міхась Хмялеўскі

Любіце друг друга — гэта ўся пропаведзь

Орля на Падляшшы з'яўляецца адным з важнейшых цэнтраў праваслаўнага жыцця на Беласточчыне. З Арлянскай гміны выводзіцца многа святароў, у гміне многа помнікаў духовай і матэрыяльнай культуры. Прыхадское свята Іаана Багаслова, якое ў народзе называюць „Іванам", у Орлі ўзнёсла і ўрачыста адзначаецца двойчы ў год: 21 мая і 9 кастрычніка. У Свята-Міхайлаўскай царкве кожны раз, нягледзячы на надвор'е, збіраецца мноства святочна апранутых жыхароў мястэчка і наваколля. Так было і ў гэтым годзе.

9 кастрычніка вернікі шчыльна запоўнілі царкву. Пусцей было толькі навокал храма; мабыць, першая зімніца паўплывала на тых — сёлета іх было значна менш, — якія ўжо па прывычцы не ўваходзяць у храм, а стаяць на пляцы або за плотам каля брамы, дзе можна пакурыць, пагутарыць або абысці ларкі. Уваходзяць яны на царкоўны пляц тады, калі раздаюцца званы і пачынаецца хрэсны ход. І так адны з хрэсным ходам урачыста абыходзяць царкву, а другія стаяць у ролі публікі. Аднак і яны ўдзельнічаюць у малітве, бо сучасная тэхніка дазваляе слухаць літургію праз мегафоны, а і мікрафон, які трымае святар, сёння бяздротавы. Гэта, як я прыкмеціў, прынялося не толькі ў Орлі, але і ў іншых прыходах, і ў кожнае надвор'е.

Свята характарызуецца асаблівым уздзеяннем на людзей. Усе, не толькі ў царкве, але і на царкоўным пляцы, і „ў рынку" за плотам — узаемна ў той дзень сардэчныя, выцішаныя. У іншыя дні такога не бывае. Ну, Іаан Багаслоў быў апосталам любові...

Святую літургію служыла каля дваццаці святароў і дыяканаў з суседніх прыходаў. У іх ліку быў і а. Віктар Шайкоўскі, выхадзец з Арлянскага прыхода, які ўжо многія гады служыць у Канадзе; прыехаў ён наведаць сваю хворую маці Анну, якая 12 кастрычніка і адышла ў вечны спачынак.

Пропаведзь сказаў настаяцель Кляшчэлеўскага прыхода а. Мікалай Келбашэўскі:

— Браты і сёстры! Сабраліся мы ў гэты намолены храм, каб паднесці малітвы. У сённяшні час трывожацца чалавечыя розум і сэрцы. Яшчэ Гасподзь дазваляе нам збірацца ў міры, здароўі і спакоі і ўсхваляць Бога нашага. А куды рухаецца чалавецтва? Мы ўсе гэта ведаем і адчуваем. Бывае, што мы бяздарныя на падзеі ў свеце, які Бог стварыў добрым і блаславіў чалавеку ўсё добрае на зямлі. Як жа часта мы наганяем зло, як жа часта мы, малыя, здалёк бачым тое, чаго не бачаць магутныя гэтага свету. А чаго яны не бачаць? Яны быццам падпісваюцца пад верай у Бога і страхам Божым, але адстаюць далёка. Глянем на сённяшняе выхаванне дзяцей, якое яно складанае і цяжкое. А, здавалася б, што час спрыяе — рэлігія прапаведваецца ў школах, ніхто не забараняе чытаць духоўныя кнігі, ніхто не забараняе гаварыць пра Бога. І нельга сказаць, што нельга нічога пра Бога даведацца. А што ж мы бачым, калі глянем на нашу краіну? Нам часта гавораць, што 95% насельніцтва, гэта хрысціяне і веруючыя людзі. Але калі мы прааналізуем адзін дзень і даведаемся, што тварыцца ў нашай краіне, дык — барані Госпадзе! Дзе ж вера, дзе страх Божы, а галоўнае: дзе любоў, дзеля якой мы сабраліся ў гэтым храме?

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Апостал і евангеліст Іаан Багаслоў быў апосталам любові. Усё ягонае жыццё, усе пропаведзі, усё навучанне абапіралася на любові да Бога і бліжняга. І яму было дадзена дайсці да Галгофы і бачыць пакуты на Крыжы Госпада нашага Ісуса Хрыста, за грахі чалавечыя. Калі ён паслабеў і не мог ужо многа гаварыць, ён толькі паўтараў вернікам:

— Дзеці, любіце друг друга.

Яму заўважалі:

— Ты ўсё паўтараеш тыя самыя словы.

А ён адказваў:

— Гэта ўсё, гэта ўся пропаведзь.

І вось, браты і сёстры, сёння дзіўна нават гаварыць тыя словы пра мір. Развіваецца тэхніка, але ў сапраўднасці мы слабеем. Я не хачу нікога палохаць, але гэта кранае і мяне, і нас усіх. Мы прычакалі такога часу, што лягаем спаць і не ведаем ці заўтра ўстанем. Такая праўда.

Таму захоўвайце веру і страх Божы і абапірайцеся на любоў, якую прапаведаваў Іаан Багаслоў дзве тысячы гадоў таму.

На заканчэнне царкоўнай урачыстасці да прысутных звярнуўся настаяцель Арлянскага прыхода а. мітрат Аляксандр Такарэўскі:

— Я сардэчна дзякую духоўным, якія памяталі пра сённяшняе свята і прыехалі маліцца з нашымі прыхаджанамі. І за тую прыгажосць, якую вы стварылі, сардэчна вам дзякую. І сардэчна віншую са святам сваіх прыхаджанаў і ўсіх гасцей. Жадаю вам бадзёрасці духа, здароўя, дастатку і шчасця ў вашым жыцці, каб стойка трымаліся праваслаўнай веры і сваёй праваслаўнай Царквы.

Адухоўленыя і радасныя вернікі пакідалі царкоўны пляц. Радавалі вочы новыя прыхадскія збудаванні: плябанія і гаспадарчыя будынкі. Усё гэта дзеецца дзякуючы настойлівасці і працавітасці а. протаіерэя Аляксандра Такарэўскага.

Міхал Мінцэвіч

Малебен за настаўнікаў

Гайнаўскае аддзяленне Праваслаўнага брацтва св. св. Кірылы і Мяфодзія і Інстытут праваслаўнай культуры арганізавалі 20 кастрычніка ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы святкаванне для настаўнікаў. Сярод прысутных былі свяшчэннікі, якія вучаць Божага закону.

Пасля Святой літургіі, якую ўзначальваў епіскап Гайнаўскі Міран, адслужаны быў малебен. Вернікі маліліся за настаўнікаў і працаўнікоў школ. Пасля сабраныя перайшлі ў царкоўнае памяшканне, дзе выслухалі даклад аўтарства манахіні Дарыі (Матвяюк) з Жаночага манастыра Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў Дайлідах на тэму „Роля манаха ў школе, у працэсе педагагічна-катэхетычнай адукацыі новага пакалення дзяцей і моладзі". Настаўніца Анна Аксантовіч, якая зачытала даклад непрысутнай манахіні, гаварыла, што манахі, якія вучаць Божага закону павінны, так як і іншыя настаўнікі, маліцца за дзяцей з якімі вядуць урокі і быць аўтарытэтам для вучняў. Аднак асноўная іх задача, гэта малітвы за ўвесь свет і збаўленне сваёй душы.

— У школе паяўляецца нездаровае спаборніцтва паміж вучнямі і выклікае яно ў дзяцей і моладзі ганарыстасць, якой павінны асцерагацца наймалодшыя, — заявіла дакладчыца. Гаварыла яна, што яшчэ з дзяцінства бацькі павінны вучыць сваіх дзяцей рабіць знак крыжа, гаварыць малітвы і не дазваляць глядзець на шкодныя для духовага развіцця фільмы. Настаўнікі павінны весці заняткі з малітвай да Бога і любоўю да вучняў. У першую чаргу павінны асвятляць праблемы звязаныя з духовым жыццём, якія цікавяць вучняў. Маладых трэба вучыць жыць згодна з Божым законам не са страху перад пеклам, а па прычыне любові да Бога. Дзеці павінны ведаць вартасць праваслаўя і не павінны пагарджаць людзьмі іншых веравызнанняў. У сваім дакладзе манахіня перасцерагае перад пакараннямі дзяцей у час раздражнення, але таксама не раіць быць паблажлівым настаўнікам. Самыя важныя ў працэсе адукацыі дзяцей вера, надзея і любоў да ўсіх акружаючых асоб.

Пасля даклада настаўнікі за кавай і гарбатай разважалі пра школьныя справы.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

На спатканне прыйшлі настаўнікі з белліцэя (на першым плане)

Асноўныя часткі царквы

Адгалоскі

У цікавым артыкуле А. Гаўрылюка „Царква ў Цехацінку" („Ніва" № 38 ад 22.09.2002 г.) здарылася павучальная памылка ў сказе: „Царква пабудавана на плане прамавугольніка з падзелам... на тры часткі: бабінец — пераход са свецкага ў сакральны свет, паперць, дзе моляцца вернікі і алтар з прастолам".

Аўтар не ведае беларускага і расійскага слова „неф" і польскага тэрміна „nawa" з грэчаскага „наўс" г.зн. плошча перад іканастасам, дзе моляцца вернікі. Алтар з прастолам з наваколлем завецца папольску prezbiterium, або месца дзе могуць быць толькі прасвіцеры, святары.

Перад нефам бачым прытвор, г.зн. *прэдхрамія*, што ў слоўніку а. Зноскі акрэсліваецца вось так: „przedsionek, pierwsza wejściowa część cerkwi prowadząca do jej wnętrza. Przedsionek dzieli się na dwie części: przedsionek wewnętrzny (або бабінец „kruchta" — pr) i przedsionek zewnętrzny (schody). Ostatni stanowi *otwartą* (без даху — pr) część cerkwi". У слоўніку Дзячэнкі *прэдхрамія* гэта менавіта паперць. Па-польску пляцык перад замкам або касцёлам гэта *podwórzec*. (pr)

Ад апрацоўшчыка: Аўтар допісу Андрэй Гаўрылюк піша нам ад шчырага сэрца, хаця і не ўсё ведае пра тонкасці свайго аб'екта. Я, апрацоўваючы яго допіс, дапусціў памылку, — errare humanum est, — за што каюся перад чытачамі, а дзякую засакрэчанаму спадару (pr). Я таксама не ўсё ведаю. І тое ж самае пра спадара (pr), які стаўляе ў царкву prezbiterium. „Słownik wyrazów obcych PWN" мае такі артыкул: **prezbiterium** (p.-łac. *presbyterium*) w kościołach rzymskokatolickich: (падкр. А. В.) część kościoła, w której się znajduje wielki ołtarz, przeznaczona zasadniczo dla duchowieństwa, oddzielona od reszty kościoła balustradą. На здымку інтэр'ера цехацінскага храма бачым іканастас, характэрны толькі ўсходнім цэрквам.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Хто паселіцца на месца старых асоб, што жывуць у Козліках?

Асімілююцца

— У Козліках гмінныя чыноўнікі прадаюць агароды каля рэчкі для жыхароў цэнтральнай Польшчы. Старыя людзі паміраюць і ў будучыні вёска можа перастаць быць беларускай, а стаць польскай, — заяўляе пратаіерэй Аляксандр Высоцкі, настаяцель Кленіцкага прыхода, да якога належаць Козлікі. — Для нашай беларускай грамадскасці крыўдна, што вырываецца кожны кавалак зямлі, дзе толькі можна. Добра было б, каб куплялі гэтую зямлю нашы людзі, напрыклад, з Беластока.

Айцец Аляксандр Высоцкі выступіў да гмінных улад у Нарве, каб фінансава ўспамаглі рамонт царквы ў Козліках. Прапанаваў ён перадаць з гміннага бюджэту частку грошай ад продажу козліцкіх участкаў, але сродкаў не атрымаў.

Людзі з Козлікаў не адчуваюць пагрозы. У вёсцы стаіць некалькі новых дамоў гарадскога тыпу. Аляксей Аўсянюк кажа, што адзін агарод купіў жыхар Варшавы, а два — жыхары Беластока. Каля адной хаты стаяць дарагія машыны. Сюды прыязджаў адпачываць міністр Владзімеж Цімашэвіч.

— Няма ў вёсцы ні кавалераў, ні маладых дзяўчат, адны старыя засталіся. Няма каму гаспадарыць, то прадаюць людзі дамы і агароды, — кажа Аляксей Аўсянюк. — Няма ў нас праблемаў з тымі, што купілі зямлю. Інакш з турыстамі, што пасяляюцца каля царквы. Паводзяць яны сябе голасна і брудзяць.

— Турысты ездзяць па вёсцы, шумяць і смецяць. Раней я прыбірала каля царквы, — заяўляе Марыя Васілюк. — Я іх не прымаю, бо не ведаю адкуль яны. Часам сплю і баюся.

Айцец Аляксандр Высоцкі намякаў, што трэба ў будучыні адгарадзіць царкоўную тэрыторыю ад дарогі. Хіба будзе гэта самым лепшым вырашэннем, каб пазбегчы гучных турыстаў, што прыязджаюць на некалькі дзён і затрымліваюцца побач царквы і рэчкі.

У Козліках толькі распачынаецца працэс продажу зямлі гміннымі ўладамі і прыватнымі асобамі. У іншых мясцовасцях распаложаных каля Нарвы і Нараўкі прыезджыя з цэнтральнай Польшчы састаўляюць ужо вялікую частку мясцовага грамадства. Асіміляцыйныя працэсы сярод беларускага насельніцтва праходзяць там хуткімі тэмпамі.

Аляксей Мароз

Колькі нас?

Адгалоска

Праўду напісаў Міхась Сцепанюк у артыкуле „Яны ўжо не беларусы". Калі адбываўся перапіс насельніцтва, да нас прыйшла студэнтка і пра ўсё распытвала, але пра нацыянальнасць не пытала. У рэшце рэшт мая жонка сказала ёй, што я — беларус. Апытальніца здзівілася і запісала нешта ў анкеце. Ці яна не чула пра іншыя нацыянальнасці ў Ольштыне? Не ведаю, ці пасля такога перапісу ў Вармінска-Мазурскім ваяводстве далічацца хаця 25 беларусаў.

Андрэй Гаўрылюк

Да 4 угодкаў смерці Аляксандра Іванюка

Настаўнік і дзеяч

З асаблівай шчырасцю ставіўся Аляксандр Іванюк да беларускай культуры, клапоціўся аб яе захаванні, рупіўся прыцягнуць да яе моладзь.

Аляксандр Іванюк нарадзіўся 28 кастрычніка 1935 г. у Сліваве Чыжоўскай гміны. У 1955 г. закончыў беларускі ліцэй у Бельску-Падляшскім, а ў 1962 г. — беларускую філалогію на Варшаўскім універсітэце. Спачатку працаваў настаўнікам у Пачатковай школе № 2 у Гайнаўцы, потым перайшоў на працу у Гайнаўскі агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання, дзе працаваў да выхаду на пенсію ў 1991 г. Двойчы быў дырэктарам ліцэя: у 1968-1971 і 1981-1991 гадах.

Усё сваё працоўнае жыццё прысвяціў навучанню дзяцей беларускай мове. Дбаў пра школу, па-сяброўску ставіўся да настаўнікаў і вучняў, адначасова быў патрабавальным да сябе і выхаванцаў.

Аляксандр Іванюк заўсёды знаходзіў час на дзейнасць у Беларускім грамадска-культурным таварыстве. У 1963-1975 гадах быў старшынёю Гайнаўскага аддзела БГКТ, а пачынаючы з 1966 г. дзевяць разоў запар выбіраўся членам Галоўнага праўлення БГКТ. У 1972-1997 гг. засядаў у Прэзідыуме ГП БГКТ. У дзейнасці Таварыства вылучаўся абавязковасцю, актыўнасцю на пасяджэннях і шчырасцю ў дыскусіях. Карыстаўся вялікім аўтарытэтам у асяроддзі.

Аляксандр Іванюк належаў да ліку пятнаццаці заснавальнікаў Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея ў Гайнаўцы. Увесь час знаходзіўся ў праўленні камітэта і яго прэзідыуме, разам са сваімі выхаванцамі дапамагаў будаваць музей.

Супрацоўнічаў з „Нівай" і „Беларускім календаром", на старонках якіх публікаваў свае артыкулы. У 1969 г. у календары з'явіўся артыкул „Гісторыя, дасягненні, перспектывы", прысвечаны дзейнасці Гайнаўскага аддзела БГКТ у 1956-1967 гадах. „Не забывай ніколі родны кут" — гэта артыкул, змешчаны ў календары на 1986 г., пра дзейнасць Гайнаўскага беларускага ліцэя ў 1945-1985 гг., які за той час выпусціў 1 466 абітурыентаў з атэстатам сталасці. Чарговы тэскт у календары на 1995 г. пад загалоўкам „Беларускі ліцэй у Гайнаўцы (гісторыя, падзеі, факты, людзі)" прынёс больш дэталёвую інфармацыю аб беларускім школьніцтве на Беласточчыне ў міжваенны і пасляваенны перыяды. Апошні, на жаль, артыкул Аляксандра Іванюка „Вытокі Беларускага музея ў Польшчы 1956-1973" надрукаваны быў у календары на 1997 г. У ім аўтар правёў разважную ацэнку ўсіх захадаў дзеячаў БГКТ па стварэнні беларускага музея ў Белавежы, які існаваў у 1967-1973 гг., і пабудове новага ў Гайнаўцы.

Аляксандр Іванюк памёр 16 лістапада 1998 г. Адышоў ад нас назаўсёды чалавек заслужаны для беларускай асветы і культурнага руху на Беласточчыне. Яго раптоўная смерць пакінула ў смутку сям'ю, знаёмых, выхаванцаў, дзеячаў, жыхароў Гайнаўкі. Тым больш здалася яна мне недарэчнай, паколькі ўраўнаважаны і жыццярадасны Аляксандр Іванюк рэдка скарадзіўся на здароўе.

Віктар Бура

Ідыліі не існавала

У н-ры 38 „Нівы" за 2002 г. быў змешчаны артыкул У. Арлова „Захоп Беларусі Расіяй", у якім аўтар апісаў, як цудоўна жылося людзям у былой Рэчы Паспалітай, як многа правоў мелі яны ў гэтай дзяржаве, як свабодна жылі між сабою уніяты, праваслаўныя, каталікі, юдэі, мусульмане. А ўсё гарантаваў ім Статут Вялікага княства Літоўскага. Ідылію гэту папсавала Расія, якая захапіла Беларусь. Даўняе Вялікае княства Літоўскае захапіла не Расія, а Польшча. Дайшло да гэтага такім чынам, што ў 1385 г. у мястэчку Крэва быў падпісаны дагавор аб уніі паміж Польшчай і Літвой — дзеля таго, каб сумесна змагацца супроць нямецкіх рыцараў-крыжаносцаў. Меў быць сумесны кароль, сумесная заграніччная палітыка, а ў апошнім абедзве дзяржавы мелі кіравацца сваімі законамі. Літоўцы прымалі ад Польшчы хрысціянства каталіцкага абраду. Першыя вынікі уніі былі станоўчымі: супольнымі сіламі была разгромлена магутнасць крыжакоў у бітве пад Грунвальдам 15 ліпеня 1410 года. Але для хрышчэння язычніцкіх літоўцаў хлынулі ў Літву таўпы польскіх ксяндзоў і польскіх феадалаў, якія ахрысцілі ліцвіноў, а затым сталі іх апалячваць, а феадалы — разглядвацца і захоплівацца лепшыя кускі іх зямель. Калі гаварыць аб хрышчэнні Літвы, то разумеем пад гэтым землі, якія і цяпер уваходзяць у састаў літоўскай дзяржавы. Але тадышняя Літва была дзяржавай грамаднай таму, што пасля разгрому татарамі ў 1240 г. Кіеўскай Русі, ваяўнічыя літоўскія князі паступова заваявалі амаль усе землі гэтай Русі, а ў 1386 г. заваладалі і яе сталічным горадам — Кіевам. Трэба сказаць, што літоўскія князі, хаця былі яны язычнікамі, вялі сябе досыць карэктна — не прыгняталі сваіх праваслаўных падданых і не чапалі іх веры. Ахрысціўшы ліцвіноў, польскія ксяндзы сталі апалячваць і акаталічваць і праваслаўных, у першую чаргу — беларускіх і ўкраінскіх феадалаў. Такая дзейнасць насілілася пасля таго, калі кардынал Гоз'юш (1504-1579) у 1564 г. запрасіў у Польшчу езуітаў для барацьбы з рэфармацыяй, якія хутка расправіліся з рэфарматарамі касцёла, а затым узяліся за праваслаўных. У 1569 г. Польшча, на сейме ў Любліне, адабрала ад Літвы ўсе ўкраінскія землі — з Кіевам і Палтавай і прылучыла да сябе, а таксама паўднёвую частку Падляшша — з Беластокам, Бельскам, Кляшчэлямі, Мельнікам, Драгічынам, але без Мілейчычаў. Літоўскія паслы пратэставалі супраць такога захопу і дэманстратыўна пакінулі сейм, але нічога не дабіліся. Такога ходу спраў У. Ягела не прадбачыў. Астаткі аўтаноміі былой Літвы ліквідавала пазней Канстытуцыя 3 Мая 1791 г.

У. Арлоў у сваім артыкуле напісаў, што вялікія свабоды ў Рэчы-Паспалітай вынікалі з дзейнічання „Статута Вялікага княства Літоўскага". Калі было так добра жыць пад правамі таго Статута, то чаму было так кепска? То ж агромнае паўстанне 1648-1654 гг. на украінскіх і беларускіх землях і шэраг меншых паўстанняў выбухла ў гады, калі дзейнічаў Статут ВКЛ? Справа заключаецца ў тым, што часта законы ў рэчаіснасці бываюць не такімі, якімі яны напісаны, а такімі, якімі начальства ўводзіць іх у жыццё.

Мікалай Капчук

Нельга забываць аб людзях

Жыхары прыпушчанскіх тэрыторый занепакоены планамі ўвядзення строгай аховы Белавежскай пушчы. Пра гэта не раз пісаў Аляксей Мароз. Героі яго артыкулаў баяцца забароны крыстацца багаццем пушчы, што стане прычынай пагаршэння ўзроўню жыцця ў прыпушчанскіх вёсках. Сапраўды, эколагі намагаюцца захаваць першабытную пушчу, не зважаючы на людзей. Апошнім часам і на гэтай тэрыторыі павялічваецца лік беспрацоўных у выніку падзення дрэваапрацоўчай прамысловасці.

На маю думку, пушчу ахоўваць трэба, але нельга забываць аб пражываючых у яе наваколлі людзях. Спачатку надлясніцтвам трэба ўзяцца за добраўпарадкаванне лясных абшараў, у якіх валяецца шмат смецця і ламачча. Турызм, які мае стаць крыніцай даходаў для мясцовага насельніцтва, не развінецца тут, калі не будзе чыстага лесу, водаправодаў, добрых дарог і таннай турыстычнай базы.

Мікалай Лук'янюк

Малое зацікаўленне

У час спаткання, арганізаванага 21 кастрычніка Сельскагаспадарчым дарадчым асяродкам з Гайнаўкі яго каардынатар і галоўны спецыяліст па эканамічна-арганізацыйных справах Геронім Панятоўскі паінфармаваў сялян пра магчымасці атрымання фінансавай дапамогі на рэалізацыю сельскагаспадарчых інвестыцый са Спецыяльнай далучальнай праграмы ў карысць развіцця сельскай гаспадаркі і вясковых тэрыторый „SAPARD". Пастаўшчыкі малака, якія хочуць атрымаць фінансавую дапамогу на інвестыцыі ад праграмы „SAPARD" павінны прадаваць штогод ад 80 да 350 тысяч літраў малака. Патрабуецца ад гаспадароў, каб мелі яны сельскагаспадарчую адукацыю або прынамсі 10 гадоў працавалі ў сельскай гаспадарцы. Яшчэ перад атрыманнем дапамогі трэба, каб былі захаваны адпаведныя ўмовы гадоўлі кароў або былі падрыхтаваны планы мадэрнізацыі абораў (адпаведная велічыня боксаў для жывёлы). Будзе правярацца таксама раслінаводства і правільнасць падрыхтоўкі кармоў.

Зараз на 10 прашэнняў пададзеных з Падляшскага ваяводства толькі з 3 гаспадарамі прадстаўнікі праграмы „SAPARD" падпісалі дамовы. Магчымасць атрымання ўспамогі з праграмы ўскладняе прынцып поўнага фінансавання інвестыцый гаспадарамі і вяртання ім 50% коштаў толькі пасля іх рэалізацыі. Карыстацца датацыямі не могуць асобы, якім за 50 гадоў і тыя жыхары, якія маюць дадатковыя даходы апрача сельскай гаспадаркі і не плацяць страхавальнай складчыны ў КРУС, а толькі ў ЗУС. Сярод 60 найлепшых гайнаўскіх жывёлаводаў толькі 15 могуць хадайнічаць аб дапамозе, а на 15 авечкаводаў — 5. Хаця працаўнікі асяродка могуць падрыхтаваць бізнесплан, то сяляне не праяўлялі ахвоты хадайнічаць аб дапамозе. Магчыма, што празмерныя патрабаванні знеахвочваюць многіх лепшых гаспадароў выступаць за дапамогай.

Аляксей Мароз

Пустыня Сахара

Недзе ў пяцідзесятыя гады адзін дзядзька з-пад Белай-Падляшскай наведаў сваіх сваякоў у Дубічах-Царкоўных. Прыехаў ён поездам і ад станцыі Вітава ішоў да нас пясчанай дарогай. Было гэта летам і дзьмуў тады моцны вецер. Лятучы пясок забіваў яму вочы і ён наракаў, што тут навокал пустыня Сахара ды дзіваваўся, як тут людзі жывуць.

Так, гэта праўда, што навокал Дубіч пясчаная зямля, але людзі неяк жывуць. Мабыць, на радзіме таго дзядзькі зямля добрая, аднак яго пад самую старасць не было каму даглядаць і ён быў гатовы сюды прыехаць, толькі неяк не атрымалася. У нас гэтыя пясчаныя выдмы людзі навучыліся абсаджваць лесам і столькі лесу, як цяпер, ніколі ў нас не было. Цяпер сяляне і іх нашчадкі надалей павялічваюць яго абшар. І гэта вельмі добра!

Калісь, яшчэ пры камуне, адна ярая камуністка наракала на партыйных сходах, што сяляне заняліся пасадкай лесу, замест карысна сеяць там збожжа і дапамагаць В'етнаму і Кубе. Я спрачаўся з ёю, гаворачы, што лес трэба садзіць там, дзе пясок лётны. Цяпер Беласточчына, дзе многа пяскоў, будзе шумець прыгожым, стройным лесам. І немец не дурны быў, калі гаварыў, што Беластоцкі край прысвечаны пад лес.

Мікалай Панфілюк

Навіны з Арлянскай гміны

Лік насельніцтва Арлянскай гміны сістэматычна падае: найбольш у гадах 1970-81 — з 7 020 на 5 649 і ў 1991-99 гг. — з 5 080 на 3 867 асоб; 30 верасня г.г. гміна налічвала 3 796 асоб. У гэтым годзе, да паловы кастрычніка, памерлі ў гміне 42 асобы (у тым ліку 21 у шпіталі).

Нямногія людзі ўступаюць у шлюб — ад некалькіх гадоў па 10-12 пар у год. З зарэгістраваных сёлета на тэрыторыі гміны 12 шлюбаў толькі адна пара рэгістравалася ў ЗАГСе; апошнія ўступалі ў канкардатны шлюб — канфесійны з грамадзянскім узаконеннем.

Дзецям найчасцей прысвойвалі імёны: Якуб, Матэвуш, Магдалена, Аляксандра, а таксама Давід, Кацпар, Міхал, Сара...

У Арлянскай гміне на 100 мужчын прыпадае 108 жанчын і гэты паказчык найбольшы ў цэлым Бельскім павеце, дзе, як і на вясковай тэрыторыі Падляшскага ваяводства, на 100 мужчын прыпадае адно 97 жанчын.

Міхал Мінцэвіч

Цёмна ў вёсках

Зараз стаяць кароткія асеннія дні. Пасля змроку на вясковых вуліцах, між іншым, у Нараўцы, Плянце, Гарадзіску і ў Новым Ляўкове ў Нараўчанскай гміне цёмна. У кастрычніку ды й з гадзіну. Пасля лямпачкі вулічных электраўстановак запальваюцца. Іх уключаюць гадзіннікі, якіх сама менш два месяцы не дапасавалі да моманту пачынаючагася змроку і ночы. Гэтыя самыя гадзіннікі выключаюць электралямпачкі а гадзіне 23^{00} на ўсю ноч да самай раніцы. Пішу пра гэта 15 кастрычніка. Падкрэсліваю, што да ўсяго гэтага — па ўсяму відаць — абыякава адносяцца солтысы, радныя, войт.

Можа, аднак, хтосьці адказны за працу вулічных электраўстановак прачытае гэтую заметку ў „Ніве" і прыедзе ў вёскі ды ўставіць вулічнае электраасвятленне паводле асенне-зімовага часу? (яц)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Настаяцель Яўгеній Здраеўскі асвяціў дарогу і памаліўся разам з жыхарамі Шастакова і навакольных вёсак (на першым плане „Незабудкі" з Курашава)

У гміну і павет

Асвячэнне і афіцыйная здача ў карыстанне 6-кіламетравай павятовай дарогі з Новага Беразова ў Чыжы, якое адбылося 6 кастрычніка ў Шастакове, завяршыло трохгадовую яе будову. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі гмінных і павятовых улад.

У шасцідзесятыя гады з выкарыстаннем грамадскіх прац сялян была выканана брукаваная дарога з Новага Беразова ў Шастакова, а ў сямідзесятыя гады зроблена была гравійная дарога з Шастакова ў Чыжы. Па гэтых дарогах жыхары невялікай вёскі Шастакова (25 дамоў) ездзілі ў гмінны і раённы цэнтры. У Шастакове засталіся гаспадарыць маладыя. Можа таму, што ў іх добрыя, бурачана-пшанічныя землі. Зараз каля 20 вучняў з Шастакова давозяць у чыжоўскую школу і раз у дзень едзе праз вёску аўтобус ПКС. У некалькіх маладых гаспадароў пад трыццаць гектараў зямлі. Гадуюць яны кароў і развіваюць свае гаспадаркі, выкарыстоўваючы добры прыбытак ад продажу цукровых буракоў і пшаніцы. У пачатку дзевяностых гадоў за ваяводскія сродкі асфальтавалі дарогу ў вёсцы, а ў 1997 г. здалі ў карыстанне клуб. Пасля жыхары пачалі намагацца, каб асфальтаваць дарогі побач вёскі і атрымалі падтрымку гмінных улад. Аднак, у павеце рамонт адтэрміноўваўся. Спачатку асфальтавалі кароткі адрэзак дарогі з Шастакова ў Новае Беразова, затым інвестыцыя спынілася. Павятовыя ўлады пераконвалі, што прыцягнуць сродкі ваяводскага сейміка, але гэтая ідэя не дачакалася рэалізацыі. Пасля рашыліся на трохкратнае замацаванне паверхні шчэбнем і эмульсіямі. Інвестыцыю выканала Павятовая ўправа дарог у Гайнаўцы.

Урачыстасць распачалася на дарозе, побач клуба, з выступлення старшыні Гміннай рады ў Чыжах і заадно солтыса Шастакова Міхала Мароза. Пасля выступіў войт Чыжоўскай гміны Рыгор Мацкевіч, а настаяцель прыхода ў Новым Беразове а. Яўгеній Здраеўскі асвяціў дарогу і памаліўся разам з жыхарамі Шастакова і навакольных вёсак. Царкоўны хор састаўлялі жанчыны з калектыву „Незабудкі" з Курашава.

Пасля сабраныя перайшлі ў вясковы клуб. Тут з артыстычнай часткай выступілі вучні Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы з Чыжоў. Перад публікай выступілі таксама беларускі калектыў „Сакрэт" з Міхалова, жанчыны з Курашава і Збуча.

Мерапрыемства закончылася абедам і вясковай забавай. Спонсарамі былі, між іншым, беластоцкія прадпрыемствы, „Вімар", „Бістар" і „ Хальгэн", у якіх працуюць выхадцы з Шастакова. Прыехалі яны ў родную вёску на святкаванні.

Аляксей Мароз

Гайнаўскі аўтавакзал — ужо з лавачкамі і стрэшкамі!

На аўтобусным вакзале ПКС у Гайнаўцы, які знаходзіцца пры чыгунцы, ужо ёсць лавачкі і стрэшкі! Зараз людзі не вымушаны стоячы чакаць пасадкі на аўтобус. Такое чаканне асабліва цяжка давалася старэйшым людзям. А калі дажджлівае або снежнае надвор'е, пасажыры моклі, чакаючы „свайго" аўтобуса. Так было ад пачатку заснавання аўтавакзала ПКС, г.зн. праз год.

Пасажыры яшчэ наракаюць, што пасадкі на аўтобусы пачынаюцца амаль у час планаванага ад'езду аўтобусаў ПКС. Шафёры маглі б гэта рабіць на 10-15 хвілін перад запланаваным ад'ездам, а так людзі вымушаны чакаць на холадзе.

Янка Целушэцкі

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl*
альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2003 r. upływa 5 grudnia 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

І зноў чатыры гады паскоранага прагрэсу Беласточчыны ў экалогіі, агратурызме, зялёных лёгкіх Польшчы, вырошчванні здаровай ежы і таму падобным...

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Маленькі Вова паказвае гасцям жывот мамы:

— Гэта мая работа! Гэта я пракалоў іголкай татавы шарыкі.

* * *

Сустракаюцца суседзі:

— Віншую! Аднак пагадзіўся ты з жонкаю!?

— Чаму так думаеш?

— Бо бачыў, як вы ўчора разам рэзалі дровы...

— Гэта не былі дровы, толькі новая мэбля.

* * *

— Чаму ты такі сумны?

— Хачу размяняць сто злотаў...

— І што: ёсць нейкі клопат?

— Няма ў мяне іх.

* * *

— Татка, што ты рабіў да шлюбу?

— Што хацеў.

* * *

Здарожаны цыган просіць гаспадыню:

— Дайце, добрая кабета, напіцца вады, бо я такі галодны, што не маю дзе спаць.

Чобаты поўныя ўсяго

Такую казку, кажу Агаце, табе на дабранач раскажу. Якую і нашто? Хопіць уключыць тэлевізар — казак там хоць адбаўляй, якую хочаш даспадобы — ці страшную, ці смешную, ці каб цябе да слёз давяла! І казаць яе не трэба, толькі вытрашчы вочы і глядзі. Не хочаш глядзець — выключыць можаш тэлік, пстрыкнуўшы пультам, або хоць вочы заплюшч. А заплюшчыш — і заснеш хутка, забыўшы пра ўсе турботы... Галоўная справа — сон добры. Калі спіш, есці не просіш... Хадзі, кажу, Агата, казку табе скажу, прытуліся да мяне, старога.

А Агата на пульце кнопкі толькі ціскае, і слухаць мяне не хоча. Злосная — куды ні глянь, усюды адно пра выбары. І на мяне злосная, і на тэлевізійнікаў, і на палітыкаў... На тэрарыстаў, на амерыканцаў, на рускіх, на чорных, сініх ды паласатых!.. На мужыкоў ды баб, і на непагоду. На прусака, што вылез з-пад ракавіны. На самаўраднікаў ды чыноўнікаў!.. Здаецца, кнопкі падушыць сваім памаляваным ружовым колерам кіпцікам. Гатова раздзерці ўсё на свеце. Мне таксама самому стала страшнавата. Як суцішыць маю каханую Агату?.. Пэўна, прытуліць, лагодай нервы супакоіць...

— Раскажу табе, Агатка, казку. Рабі, што хочаш, але трэба табе яе паслухаць.

Не, не клею з сябе дурня, і з цябе нічога не клею. Трэба нам адно з адным размаўляць, а то гутарыць народ пазабываўся. Што, прымяркоўваю цябе да народа? А да каго ж маю прымяркоўваць! Ну, давай нармальна паразмаўляем. Тая казка дык гэта, мабыць, жарт такі быў, мяне, старога жулічка... Што, хай будзе казка?..

Прылеглі мы на канапе поруч сябе, як галубкі ў гнездзейку.

— Неяк дзіўна, Ваня, як наш тэлевізар не ўключаны...

— Мо і дзіўней, што дзеці не бегаюць...

— Ты, кінь ты свае вечныя гавэнды пра дзяцей. Ужо час не той, каб такую гаворку заводзіць...

— Усё казкі гэта.

— Ну, дык давай сваю казку.

— Жылі-былі на свеце дзед і баба. І была ў іх сучка Гарэшка. Залатая, не прастая. І знесла Гарэшка...

— Хіба ж не яечка? Залатое, не прастое. Што, казкі мне ўжо блытаюцца?

— І знесла Гарэшка з гарышча боты зусім як новыя. Калісьці купіла тыя боты баба, ды насіць не насіла, бо з моды раптам выйшлі. Раз толькі іх надзела, пасля панапіхвала ў іх газет і занесла на гарышча. Сумуюць боты без бабы год, два, тры...

— А што за боты? Ніяк не ўспомню...

— Пэўна, чырвоныя чобаты. Ходзіць бусел па балоце, у адным чырвоным боце...

— Ты зноў пра бусла?!

— Бусел, бусел-клекатун, парваў бабу за каўтун!

— Я дам табе „за каўтун"! Ну, што за боты... — Агата ўжо не магла ўлежаць.

— Ты што ёрзаешся, бы крапіўкаю-жыгучкаю табе пакамзыталі, Агата... Скажам... Чырвоныя боты-казачкі. Не, звычайныя гумовыя чабаткі, добрыя на асеннюю слату. Ацепленыя ўнутры байкай. Цёпла ў іх, як у вушку...

— А шмат яны каштава... Каштуюць?

— З пяць тысяч злотых...

— Што-оо? Муселі б быць залатыя, а і серабром насыпаныя па самыя халяўкі!

— Гэта на старыя грошы... Ну, ужо ўстаеш? Казка ж няскончана. Мае там быць пра тое, як Мышка прыбегла, языком махнула...

— Адчапіся ад Мышкі. Што язык у яе доўгі, што праўда, то праўда... Зараз і скажа, што ў староцці нашуся!..

Не так казка баецца, як час бавіцца. Чабаткі былі якраз не на гарышчы, бо ў нас яго няма, а ў шафцы ў падвале. Прынесла іх Агата дахаты. Стала вывалакаць з сярэдзіны паперы. А там, сярод пагімячаных газетных старонак — мае машынапісы, якіх я шукаў калісьці, як адурнелы. Мае там былі „Казкі для дарослых". Пра Ядвігу Бельска-Падляскую і ейную „кумпанію" з крызіснага часу („Салон Я. Б-П."). Што іх цэнзура забараніла! О-то-то час быў!

Вандал АРЛЯНСКІ

Крыжаванка



Гарызантальна: 3. настаяцель каталіцкага манастыра, 8. хімічны элемент н-р 76, 9. старажытная дзяржава вакол азёр Ван і Урмія з цэнтрам у Тушпе, 10. хімічны элемент н-р 17, 11. устаноўленая мера, 13. вулкан на паўвостраве Аляска (2047 м.), 15. горад на ўсходзе Кот-д'Івуар, 16. кітайскі горад у правінцыі Хунань, 20. цагельны завод, 22. горад між Туравам і Мазыром, 23. вялікая французская рака, 27. адзінка падліку роўная дзесяці, 29. разбурэнне цвёрдай тканкі косці зуба, 30. дэталь для накручвання на шрубу, 31. Бруна, нямецкі пісьменнік (1900-79), 32. трапічная птушка сямейства буслоў з доўгай дзюбай і галавой без пер'я, 33. тлумачэнне незразумелага слова на палях старажытных рукапісаў, 34. французская рака, левы прыток Сарты.

Вертыкальна: 1. жывы арганізм, 2. вялікі продаж тавару звязаны з выстаўкай, 4. шпіталь, 5. порт на паўднёвым захадзе Фінляндыі, 6. група нацыянальнасцей у цэнтральнай, усходняй і паўднёвай частцы Афрыкі, 7. ахоўнік, абаронца, 12. Іраклій, грузінскі літаратар (1909-92), 14. спецыяліст па археалогіі, 16. інданезійскі горад на Яве між Семарангам і Сурабаяй, 17. афіцыйны зварот урада адной дзяржавы да другой, 18. разам са Сцвігай зліваецца ў Маству, 19. граніца, 21. кармавая расліна сямейства злакавых, 24. разам з Мараньёнам зліваецца ў Амазонку, 25. Мацьяш, лідэр венгерскіх камуністаў у 1945-56 гг., 26. будан, 27. прылада для акурвання пчол дымам, 28. казацкі афіцэрскі чын у царскай арміі. (Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца прышлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 38 нумара

Гарызантальна: купюра, плешка, Гудзан, неба, спеў, казлабарод, Бань, Акен, костка, карова, Нансей.

Вертыкальна: Кунене, рагу, план, Катаеў, дзекабрыст, Бакань, сподак, бацька, Енісей, Кова, Кана.

Рашэнне: **Дзеўка не конь, аброць не надзенеш**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Прафсаюзная восень

Асеннія ўнутраныя і знешнія ўмовы паўплывалі на тое, што Сандар Жоржавіч з болем галавы давалокся на паляну, на чарговы сход уселяснога кіраўніцтва.

— І яшчэ, вось, надвор'е супраць мяне, — падумаў паміж адным і другім зяўкамі. Ды трэба было. Агульная сітуацыя добрая не была. Неабходна было ўсчаць адпаведныя, а нават і неадпаведныя дзеянні.

— У сённяшняй сітуацыі цяжар спачывае на дзіку Свіналычу, — пачаў мядзведзь.

Свіналыч не прысеў, не падмяў, як звычайна, пярэдніх капыт пад сябе. Хацеў гэткім чынам паказаць, што не сагнецца перад успомненымі мядзведзем цяжарамі. Раптам з зачараваннем глянула на яго лань Гаўрусіха:

— Ці ж ён сам гэта будзе?! Так цвёрда стаяць на падмочанай асеннімі дажджамі зямлі! — думала, вырачыўшыся на дзіка.

— Вы, Свіналыч, мусіце самкнуць шэрагі ўселясной брацыі. Трэба, значыць, арганізавацца ў ведамственныя прафсаюзы, значыцца, па відах: вавёрка з вавёркай, заяц з зайцам і гэтак далей.

Заяц Генік паклаў вушы па сабе.

— А-ёйку, а што ж гэта мела б значыць? — перабегла яму па зайчынай галаве.

— Мабыць, можа быць і іначай, — працягваў Жоржавіч. — Так сказаць, пастраўнікаваму. Хай прыстаюць да сябе тыя, што жаруць тое самае. Мясаедныя да мясаедных, траваедныя да траваедных, ну, і гэтак далей.

— Ды ж прафсаюзы ўжо ў нас ёсць, — пасмеў прабалбатаць вавёр Розік, спецыяльны госць сходу, уселясны прафсаюзны правадыр ад незапамятных часоў.

— Ёсць, ды быццам у нас іх няма, — адказаў мядзведзь. — Справа ў тым, каб абараняць правы і свабоды лясной брацці.

— А ад каго? — дапытваўся вавёр.

— Ну, без нахабства, прашу не перарываць! — знерваваўся Сандар Жоржавіч, хапаючыся лапамі за збалелую галаву. — Пра што ж я гэта гаварыў? Ага!.. Абараняць правы і свабоды лясной брацці, а перш за ўсё павышаць наш мядзведжы аўтарытэт. Трэба арганізаваць спаборніцтвы ў яго росце. А вы, вавёр, што дагэтуль рабілі?

— Ну-ууу... — Розік спрабаваў апраўдвацца.

Вавёр выграб першы лепшы арэх і ўгрызся ў яго не на жарты.

— Ну, што вы рабілі? — рытарычна дапытваўся Жоржавіч. — Нічога вы не рабілі. Нейкія там экскурсіі па ўзлесках. А нашто тыя экскурсіі. Што, можа хочаце адшукаць змяю Ссапію і вужа Ззянона? Калі хто хоча экскурсію, хай сам на яе выбярэцца. Ваша задача — арганізаваць віды ды чароды і павышаць наш аўтарытэт. Павышаць, павышаць, павышаць.

Мядзведзь, выказваючы апошнія словы, падымаў галаву ўсё вышэй і вышэй, аж урэшце ўзвыў. Штосьці ад таго ўздыму трэснула яму ў карку.

— Ну, канец. Мазгі штосьці ў мяне не на месцы. Гэта ўсё з-за восені. Ну, брацця, трэба брацца за работу. За працу брацца трэба, Свіналыч. Вавёр вам дапаможа. З'яднайце сілы дзеля нашага дабра.

Велічнасць Сандар Жоржавіч памалу адвярнуліся ў бок бярлогі. На канец у той бок адвярнулася ўсё ўзнятая мядзведжая мазгаўня.

МакХОЛАД

ISSN 0546-1960